№ 28 (482) 4 жніўня 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Чаму ўпаў «БелКА»

«Па гэтым пытаньні працавала камісія, якая ўсё прааналізавала і зрабіла выбар на карысьць Расеі».

**Старонка 5.**

## 120 000 кілямэтраў салідарнасьці

**Павал Севярынец:** Беларуская салідарнасьць здольная накарміць, апрануць, абараніць і натхніць кожнага, хто трапіў пад удар рэжыму.

**Старонка 12.**

Віталь Сіліцкі пра рэвалюцыю духу й задачы дэмакратычнага руху на бліжэйшыя гады.

Старонка 8.

# Што трэба памятаць кожнаму беларусу

**У ліпені на выданьне «НН» надышло столькі ахвяраваньняў, што няма як здрукаваць увесь сьпіс дабрадзеяў. Выдрук сьпісу ліпеньскіх фундатараў працягнем у жніўні. Шчыры дзякуй усім за шчодрасьць.**

Асаблівая падзяка падпісчыкам зь Бешанковіцкага раёну В.Г. і Т.К., якія шчыра і рэгулярна падтрымліваюць «Нашу Ніву».

Б.К., Мікалаю К. з Стаўпецкага раёну.

Андрэю І., Аляксею Л., В.К., Таціяне К., Уладзімеру В., Тамары Ф., Віктару, Івану Ш., І Б., К.М., Уладзімеру Л., Я. Б., В. Ч., Ф., Д.П. зь Берасьця.

Вользе С. з Глыбоцкага раёну.

Алесю Х. з Маладачанскага раёну.

Зьмітру Д., А. Д., Дзянісу Ш. з Бабруйскага раёну.

Міхаілу Т. са Слуцку.

Максіму К., Розе М., Марыі Б., Лідзіі С., Алене З., М.Р., Б.Я., Генадзю Л., Валянціне К., М., Любові П. з Гомелю.

С.К., А.Ф., У. В., Пятру П., Мікалаю Ж., Сяргею К., Алене Д., Аўгену І., А.Ф., Уладзімеру В., Пятру П. з Горадні.

Ірыне Ж. з Наваполацку.

Канстаціну Я. з Жодзіна.

Аляксандру Г., Лідзіі А., Тацяне М., Сяргею Г., Сяргею В. з Баранавічаў.

Фёдару Г., А. С., Анатолю С. з Мазыра.

Уладлене Д., Ніне Б. з Кобрынскага раёну.

Уладзімеру Т. Г.Р., В.В., У.М. са Смургонскага раёну.

Ф.Р., Ганьне С., В.З., Н.А., Тацяне Х., Валер'ю С., Тамары К., Сяргею К. зь Пінску.

Алене У., Базылю К., Вользе П., Дз.С., Аляксею К., Т.Б. з Магілёва.

Сяргею А., Юр'ю Т., А.Ю. з Дрыбінскага раёну.

Паўлюку С. з Горак.

А.Л. са Жлобіна.

Адзе Р. з Шаркаўшчынскага раёну.

Альфонсу Р. з Навасельцаў.

Тацяне Ш., Сяргею Р., Л.Ц., Л.А., Івану М., Тадэвушу Ш. з Маладэчна.

У.Б., Я.Ю. з Ваўкавыску.

Людміле Р. з Капыльскага раёну.

З.М., Л.Н. з Валожынскага раёну.

В.С., Ігару К. з Воршы.

В.П., Ірыне Я., Веры К., Аляксандру В. зь Віцебску.

А.К., Ю.К. з Крупскага раёну.

Пётру Ш. зь Віцебскага раёну.

В.Ф. з Крычаўскага раёну.

Генадзю Г., А.Л., Віталю С., В.А., Сяргею Ц., Аляксею Ч. з Баранавіч.

Іне С., Сяргею С., Галіне Г., О.Ж. з Барысава.

Вользе К. зь Берастравіцкага раёну.

В.М. зь Менскага раёну.

Аляксандру С., І.С., Вользе С., Георгію М., Андрэю Ш., Канстанціну Ж., Г. Леаніду В. з Лагойскага раёну.

Сяргею Т., Р.Д. зь Лідзкага раёну.

А.С. зь Мёрскага раёну.

А.С., Ю.К. зь Мядзельскага раёну.

Сяргею С., Кацярыне П., Ф.Н. з Полацку.

Г.К., Міхаілу У., З., А.Ш., Т., Анатолю П. з Салігорску.

Кастусю Ж., В.К., Зьмітру Н. са Сьветлагорску.

Р.Ф., Л.Д. з Талачынскага раёну.

Аляксандру П., Натальлі І., Васілю С., І.Л., А. М., В.П., Аляксандру М., Багуславу У., Тацяне Л., М. Б., М.Г., А. К., Мікалаю Дз., А.К., Г.С., Ігару С., Д.С., Г.Б., Сяргею К., В.К., Аляксандру Я., Міхаілу З., Анатолю М., Розе Г., Ксені Д., Тамары К., М.А., Віктару П., Уладзімеру І., Уладзімеру Г., Васілю С., В.К., Жаньне К., А.Т., Сьвятлане Х., Валянціне П., Раісе К., І.Л., Алене М., В.П., Аляксандру М., Тацяне Л., Марыі Б., М.Г., Аўгену К., Мікалаю Дз., А.К., Г.С., Юр'ю М., Н.Ц., Вользе С., Ігару Г., Ігару С., Д.С., Г.Б., Сяргею К. зь Менску.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.** Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84; e-mail: dastauka@tut.by; паштовы адрас: а/с 537, 220050, Менск;

2) просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас.**

0402280179

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа

**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | |
| | | | |
| | | Пеня | |
| | | Всего | |

Кассир Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа

**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | |
| | | | |
| | | Пеня | |
| | | Всего | |

Кассир М.П. Плательщик

# Жалезная заслона

Суд над юнакамі, якія спрабавалі арганізаваць незалежнае назіраньне за выбарамі, адбываецца ў закрытым рэжыме. Каля суду дзяжурыла Тацяна Сьнітко.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**На фота справа — Аляксандар Шалайка, унізе — Эніра Браніцкая.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Суд над актывістамі незарэгістраванай арганізацыі «Партнэрства», што старанна ахоўваўся ад грамадзкасьці сіламі міліцыі і спэцслужбаў, быў відаць з кожнага тралейбуса, які праязджаў па вуліцы Багдановіча. Паколькі нават сваякоў Цімоха Дранчука, Эніры Браніцкай, Аляксандра Шалайкі ды Мікалая Астрэйкі не пускалі ня тое што ў будынак, а і на ганак, група падтрымкі мусіла з ранку да вечара стаяць на вуліцы.

У першы дзень людзі ў цывільным не дазволілі прысутным ля суду людзям сесьці на лаўку ў двары. Забарону не зьнялі нават для цяжарных жонак М.Астрэйкі і А.Шалайкі. Тады добрыя людзі прывезьлі некалькі плястмасавых крэслаў. Некалькі дзяўчат падвезьлі прысутным мінэральную ваду, булачкі, цукеркі. На другі дзень ужо дазволілі сядзець на лаўцы. Праўда, ахова засьцераглася ад магчымых акцыяў салідарнасьці, паставіўшы на ўезьдзе ў двор знак «праезд забаронены». Як прызнаўся адзін міліцыянт, апазыцыя магла падагнаць машыну пад пажарную лесьвіцу, па якой тады лёгка ўзабрацца і вывесіць сьцяг на даху.

Сваю салідарнасьць з арыштаванымі людзі выяўлялі аплядысмэнтамі, калі юнакоў вялі ў аўтазак і з аўтазака. Да кожнага зь іх былі прыстаўлены па тры канваіры, якія загадзя забаранялі паварочваць галаву і размаўляць. Рукі падсудных былі ў

Працяг на старонцы 4.

# Жалезная заслона

Працяг са старонкі 3.

кайданках, а праводзілі іх вельмі хутка. Самы першы раз маладых людзей завялі з аўтазака ў сутарэньне суду, потым сталі вадзіць праз іншыя дзьверы. Родныя, сябры, паплечнікі, журналісты, нават замежныя дыпляматы лавілі момант, каб хоць лішні раз убачыць Эніру, Аляксандра, Мікалая і Цімоха — мэтраў з трыццаці. Падчас судовых пасяджэньняў людзі спрабавалі зазірнуць у вокны, але за шыбамі былі зашморгнутыя жалюзі.

У панядзелак грамадзкасьць пашыхтавалася уздоўж ходніку каля самай праезнай часткі. Здалёк гэта было падобна на пікет. Хоць не было ні сьцягоў, ні партрэтаў, толькі адна жанчына трымала ў руках парасон зь бела-чырвоных кліноў. Спэцназаўцы ў джынсах і футболках спрабавалі прымусіць людзей «разысьціся», але тыя й ня думалі пікетаваць.

У пятніцу і панядзелак у дворыку каля суседняга дому стаяў аўтазак-МАЗ. У аўторак экспанат Кастрычніцкай плошчы зьнік, затое навокал паболела апэратыўнікаў.

Адвакаты не даносяць ніякай інфармацыі пра ход працэсу, бо далі падпіску пра нераскрыццё. Але яшчэ да суду адвакат Цімоха Дранчука Павал Сапелка неаднойчы падкрэсьліваў у гутарках з журналістамі, што да справы назіральнікаў ня маюць ніякага дачыненьня паказаныя па ТБ атрыбуты «змовы».

У першы дзень удалося дазнацца, што трое абвінавачваных прызналі віну часткова, Цімох Дранчук наагул не прызнаў яе. У аўторак па абедзе судзьдзя Ясіновіч загадаў сілавікам прымусова даставіць у суд трох сьведкаў абвінавачаньня, якія, не жадаючы паўтараць дадзеныя ў часе сьледзтва паказаньні, ад удзелу ў судзе адмовіліся. Іх прывезьлі раніцай у сераду. Увесь гэты дзень людзям давялося чакаць ля будынку суду пад залевай.

Тлумачэньне прычынаў закрытасьці судовага працэсу над «Партнэрствам» афіцыйнай фармулёўкай «у мэтах абароны сьведкаў» выглядае надуманым. Засталося трывалае ўражаньне, што сапраўдныя прычыны жалезнай заслоны над «Партнэрствам» іншыя.

Зрэшты, канчаткова кропкі над «і» паставіць прысуд над актывістамі. Калі гэты нумар падпісваўся ў друк, стала вядома, што пракурор Андрэй Мігун запатрабаваў для А.Астрэйкі тры гады калёніі і па два гады — для ўсіх іншых падсудных. Магчыма, прысуд будзе вядомы, калі выйдзе гэты нумар.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Сваякі падсудных неадлучна дзяжурылі пад будынкам суду.**

# «БелКА» ў цытатах

[Пра «нацыянальнасьць ракеты-носьбіта] «Адпраўляць запыт у ангельскія ці амэрыканскія фірмы было бессэнсоўна. Там цэны ў 2—3 разы вышэйшыя, чым у Расеі. Па гэтым пытаньні працавала камісія, якая ўсё прааналізавала і зрабіла выбар на карысьць Расеі».

*Сяргей Залаты, гендырэктар прадпрыемства «Геаінфармацыйныя сыстэмы», у інтэрвію «Нашай Ніве» 20 лютага 2004 г.*

«Беларуска-расейскі спадарожнік БелКА становіча паўплывае на прагназаваньне надвор'я на тэрыторыі Беларусі».

*Марыя Германчук, супрацоўніца Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя, прэс-канфэрэнцыя 22 сакавіка 2006 г.*

«Падчас выпрабаваньняў у 90% выпадкаў можна знайсьці непаладкі і збоі, якія потым немагчыма выправіць у космасе».

*Сяргей Залаты ў інтэрвію агенцтву БелаПАН 11 красавіка 2006 г.*

«Спадарожнік паводле сваіх тактычна-тэхнічных, тэхналягічных характарыстыкаў уваходзіць у дзясятку найлепшых сусьветных аналягаў. Яго запуск стане таксама яскравай, іміджавай падзеяй і аб'ектыўна ўнясе Беларусь у прэстыжны сьпіс касьмічных дзяржаваў».



*Пётар Клімук, інтэрвію радыё «Свабода» 26 ліпеня 2006 г.*

«Беларусі гэта нічога не дае. Я кажу: засталося яшчэ зрабіць падводную лодку. Гэта ўсё не патрэбна краіне. Але трэба піяр-кампанія, каб на непатрэбных рэчах накруціць нейкі імідж Лукашэнку».

*Аляксандар Вайтовіч, інтэрвію радыё «Свабода» 27 ліпеня 2006 г.*

«Аляксандар Лукашэнка мужна прыняў удар, даведаўшыся, што першы беларускі спадарожнік БелКА страчаны».

*Супрацоўнікі «Раскосмасу» у інтэрвію «Российской газете» 28 ліпеня 2006 г.*

**Падрыхтаваў ЗП**

# На вяроўцы з шостага паверху

спусьцілася, ратуючыся ад арышту, актывістка «Бунту».

26 ліпеня ў Менску ў шэрагу моладзевых актывістаў былі праведзеныяператрусы. Сярод іншых міліцыянты наведаліся і да Тацяны Елавой. Супраць Тацяны ўзбуджана крымінальная справа за віцебскія акцыі «Бунту», калі былі вывешаны бел-чырвона-белыя сьцягі й раскіданы ўлёткі.

Міліцыянты сем гадзінаў ламіліся ў кватэру актывісткі на вуліцы Варанянскага і былі зьдзіўленыя, калі, выбіўшы нарэшце дзьверы ды адсунуўшы мэблю, якою дзьверы былі забарыкадаваныя, Тацяны ў кватэры не знайшлі.

Як стала вядома «НН», Тацяне нехта здолеў перадаць вяроўку, і яна па ёй спусьцілася з 6-га паверху.

Сама Тацяна цяпер хаваецца, і зьвязацца зь ёй немагчыма.

**Сямён Печанко**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Тацяна Елавая ставіць намёты на Плошчы. 20 сакавіка.**

## Дзяржкантроль закупляе мундзіры

Камітэт дзяржкантролю абвясьціў тэндэр на закупкі парадных гарнітураў — кіцель і нагавіцы ў камплекце. Замоўцам 600 камплектаў вопраткі выступае канцэрн «Белрэсурсы». Тэрмін тэндэру — да 11 жніўня.

**АШ**

## У інтэлектуальным разьвіцьці Беларусь адстае ад суседзяў

У сусьветным рэйтынгу інтэлектуальнага разьвіцьця Беларусь займае 60-е месца, Эстонія — 22-е, Літва — 32-е, Латвія — 33-е, сьведчаць зьвесткі, прыведзеныя Сусьветным банкам.

Пры падрыхтоўцы рэйтынгу 128 краін улічваліся ўзровень адукацыі насельніцтва, колькасьць тых, хто карыстаецца Інтэрнэтам і тэлефонам, заканадаўчая база, колькасьць навукоўцаў, колькасьць і наклад навуковых выданьняў. Рэйтынг вызначаўся па дзесяцібальнай сыстэме.

У першую пяцёрку ўвайшлі: Швэцыя (9,25), Фінляндыя (9,11), Данія (9,08), Швайцарыя (8,84) і Вялікая Брытанія (8,8). Беларусь атрымала 4,93 бала.

З постсавецкіх краін найвышэйшы бал атрымала якраз Эстонія — 8,05. У Літвы 7,26, Латвіі — 7,06. Расея займела 5,97 (41-е месца), Украіна — 5,37 бала (49-е).

Апошняе месца мае Сьера-Леонэ (0,46).

**МБ**

# Чыгуначная інтэграцыя



Імаверны пераемнік Пуціна наведаў Менск.

Напярэдадні свайго прафэсійнага сьвята беларуская і расейская чыгункі вырашылі парадаваць пасажыраў добрай навіной. З 1 жніўня пачынае працу звышхуткі цягнік «Славянскі экспрэс», які будзе курсаваць між Масквой і Менскам. З гэтай нагоды і быў зладжаны тэлемост паміж дзьвюма сталіцамі.

Адным з удзельнікаў ад маскоўскага боку значыўся Ўладзімер Якунін, прэзыдэнт ААТ «Расейская чыгунка». Маскоўскія паліталягі апошнім часам актыўна абмяркоўваюць яго кандыдатуру ў якасьці магчымага пераемніка Пуціна. Было цікава паслухаць, што думае патэнцыйны гаспадар Крамля аб беларуска-расейскіх узаемадачыненьнях.

Маскоўскі вядоўца асабліва гучна і патасна аб’яўляў выступ Якуніна. Сам жа былы гэбіст Якунін не абмінуў магчымасьці скарыстаць момант для свайго піяру. Сярод іншага ён адзначыў, што чыгункі нашых краінаў заўсёды своечасова выконвалі абяцаньні перад сваімі пасажырамі і вельмі добра было б, каб таксама працавалі і палітыкі. Чыгунка, паводле словаў Якуніна, выконвае і сацыяльныя, і палітычныя мэты.

Пасьля Якунін перайшоў да звычайнай інтэграцыйнай рыторыкі: «Славянскі экспрэс» будзе збліжаць ня толькі адлегласьці між сталіцамі, але й самі народы.

Апошняя фраза прэзыдэнта расейскай чыгункі была накіраваная да ўладных колаў Беларусі і Расеі: «Няма нічога немагчымага, калі ёсьць супольнае жаданьне. Думаю, у будучыні беларусы і расейцы будуць часьцей сустракацца на сьвятах дружбы і яднаньня».

Затым ужо начальнік Беларускай чыгункі Ўладзімер Жарэла амаль паўтарыў словы Якуніна, двухсэнсоўна заявіўшы: «Добра было б, каб усе структуры саюзнай дзяржавы працавалі таксама, як чыгунка».

Але асабліва агаломшыў прызнаньнем пра беларуска-расейскі саюз намесьнік старшыні Менскага гарвыканкаму Міхаіл Ціцянкоў, які заклікаў пасажыраў «Славянскага экспрэсу» часьцей карыстацца яго паслугамі, а пасьля ўмацоўваць інтэграцыю ў застольных бяседах.

Пасьля заканчэньня тэлемосту гледачоў забаўлялі танцамі і сьпевамі артысты «Церніцы». І толькі апранутым у цывільнае ахоўнікам было не да адпачынку.

Цягнік паміж Менскам і Масквой цяпер будзе хадзіць на дзьве з паловай гадзіны хутчэй, чым раней (сем з паловай гадзін). гэта і выглядае самым істотным здабыткам інтэграцыі за апошнія 10 гадоў. Добра, каб так было й надалей.

**Зьміцер Панкавец**



**Яшчэ пяць гадоў таму Якаў Трашчанок быў ардынарным магілёўскім выкладчыкам.**

# Трашчанок зарэзаў атляс

Забаронены яшчэ адзін дапаможнік па гісторыі Беларусі.

Гісторык Алег Перзашкевіч, які працуе на катэдры старажытных часоў і сярэднявечча гістфаку БДУ, падрыхтаваў атляс па гісторыі Беларусі XVI—XVIII ст. для вучняў сёмай клясы. Аднак найхутчэй школьнікі ня ўбачаць яго ў верасьні.

Атляс прайшоў праз інстанцыі Мінадукацыі, але пасьля быў накіраваны на разгляд дзяржкамісіі, хоць падобная практыка ніколі не прымянялася да атлясаў. І забуксаваў. «Была рэкамэндацыя ад камісіі, што праца павінна быць дапрацавана за подпісам Якава Трашчанка, — кажа Алег Перзашкевіч. — Гэтая камісія за апошнія тры гады, здаецца, нагул ніводнага дапаможніка не зацьвердзіла, апроч «Курсу па Вялікай Айчыннай вайне». Пакутуюць усе, ня я адзін». Я.Трашчанок стаў вядомы шырокай грамадзкасьці як аўтар цемрашальскага падруч—ніка па гісторыі Беларусі, рэкамэндаванага для выкарыстаньня ў ВНУ, а таксама як колішні выкладчык А.Лукашэнкі.

У краіне з 1993 г., калі ў школах пачалі вывучаць курс па гісторыі Беларусі, выйшла толькі два атлясы — па гісторыі старажытнай Беларусі, а таксама па гісторыі Сярэднявечча. Па гісторыях больш раньніх пэрыядаў вучні ня маюць ніякіх дапаможнікаў, каб рыхтаваць урокі, апроч самога падручніка.

Тым ня менш сп.Перзашкевіч лічыць Я.Трашчанка ахвярай сытуацыі, што склалася ў гістарычнай навуцы. «Трашчанка папрасіў заняцца гэтым прэзыдэнт, і ён не адмовіў, хоць і мог, спаслаўшыся на стан здароўя ці нешта іншае. Магілёўскага выкладчыка зрабілі нейкім пудзілам, хоць я ня схільны разглядаць яго як усёмагутнага цэнзара. Па-чалавечаму мне нават шкада яго», — кажа А.Перзашкевіч. Ён лічыць, што калі атляс і трапіць на разгляд, дык будзе забракаваны, хоць там і няма супярэчнасьцяў з падручнікам па гісторыі для сёмай клясы.

«Усе чакаюць загаду зьверху», — сьмяецца А.Перзашкевіч.

**Зьміцер Панкавец**

# Кубак УЭФА:
## пакуль крочым бяз стратаў



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Заўзятары «Дынама» (Менск) цешацца перамозе клюбу ў кубку УЭФА.**

Вынікі першых матчаў беларускіх клюбаў у Кубку УЭФА надавалі аптымізму. БАТЭ (Барысаў) дома перамагло малдаўскую «Ністру» – 2:0. Менскае ж «Дынама» у гасьцях у польскім Любліне разыграла выніковую нічыю 1:1 зь мясцовым «Заглэмбе». Гэта пакідала менчукам добрыя шанцы, трэба было толькі не прапусьціць у свае брамы дома. І «Дынама» гэтую задачу вырашыла, разышоўшыся нулявой нічыёй з палякамі.

БАТЭ ў сваю чаргу перамагло «Ністру» і ў Кішынэве — усё вырашыў адзіны гол, які на 30-й хвіліне забіў Генадзь Блізьнюк.

28 ліпеня ў швайцарскім Ньёне адбылося лёсаваньне другога раўнду Кубку УЭФА. У супернікі «Дынама» трапіла славацкая «Артмэдыя», якая летась гуляла ў групавым турніры Лігі чэмпіёнаў. А БАТЭ пазмагаецца з казанскім «Рубінам», хоць аматары чакалі візыту францускага «Марсэлю». Во было б відовішча!

**Зьміцер Панкавец**

# Непалітычны футбол

У мінулы ўік-энд прайшоў X традыцыйны турнір «Кубак Свабоды», прымеркаваны да Дня Незалежнасьці. Апошнія сем гадоў ён носіць імя Генадзя Карпенкі, чалавека, які шчыра любіў футбол. Ён зьяўляўся капітанам каманды Вярхоўнага Савету, а клюб з Маладэчна не пялёхаўся ў багне другой лігі, а змагаўся за мэдалі ў вышэйшай.

Гэтым разам «Кубак Свабоды» разыгрывалі пяць камандаў — партый БНФ, АГП, ПКБ, БСДП (Г), а таксама зборная журналістаў. Гульні праходзілі на стадыёне «Вымпэл» у парку Чалюскінцаў.

Фаварытам турніру лічылася каманда журналістаў, якая выйгравала турнір апошнія тры гады, але й «партыйцы» не хацелі аддаваць пальму першынства.

Варта было бачыць, зь якім імпэтам і жаданьнем выходзілі палітыкі на кожную гульню, як яны змагаліся за кожны мяч, за кожны мілімэтар пляцоўкі. Нават падумалася — такі б спрыт ім на ўжо блізкіх мясцовых выбарах. Тады б супернікі нават ня мелі ніякіх шанцаў на перамогу.

Абаронца Анатоль Лябедзька, не шкадуючы ног сваіх, слаўся ў падкатах, галкіпэр Аляксандар Старыкевіч выцягваў неймаверныя мячы, а Сяргей Калякін хоць і не гуляў, але шчыра хварэў за прыгожы футбол. Усе ўдзельнікі турніру падкрэсьлівалі яго непалітычнасьць, хоць на плоце побач і красаваліся сьцягі партый.

Кубак Свабоды — гэта проста добрая магчымасьць сабрацца разам і пакантактаваць у нефармальнай абстаноўцы, бяз спрэчак па палітычных пытаньнях.

А перамог мацнейшы. Журналісты і сёлета не пакінулі супернікам шанцаў. Праўда, камуністы, якія зрабілі зь пераможцамі нічыю, абяцаюць налета ўзяць рэванш.

**Зьміцер Панкавец**

# Запрудніку і Надсану спаўняецца 80

Д-р гісторыі Янка Запруднік і а.Аляксандар Надсан гэтымі днямі сьвяткуюць 80-годзьдзе. Айцец Аляксандар нарадзіўся 8 жніўня 1926 г., Янка Запруднік — 9 жніўня.

**Аляксандар Надсан (на фота справа)** — адна з галоўных фігур грамадзкага і царкоўнага беларускага жыцьця ў Вялікабрытаніі, апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў у замежжы, дырэктар Беларускай бібліятэкі імя Ф.Скарыны ў Лёндане — найлепшага збору беларусікі ў Заходняй Эўропе. Тая бібліятэка заўсёды гасьцінна прымае наведнікаў. Працягвае ў ёй навуковыя дасьледаваньні і а.Аляксандар. Цягам апошніх месяцаў убачылі сьвет





дзьве ягоныя кнігі: «Pro patria aliena: Кляштар беларускіх айцоў-марыянаў у Друі» і перапрацаванае выданьне кнігі пра Магдалену Радзівіл ды Грэка-каталіцкую царкву ў Беларусі.

**Д-р Янка Запруднік (на фота зьлева)**, выпускнік Лювэнскага ўнівэрсытэту, доўга працаваў на радыё «Свабода», рэдагаваў газэту «Беларус». Ён стаў ня толькі летапісцам найноўшай гісторыі Беларусі, які ў сваіх артыкулах рэагуе на кожную падзею на Бацькаўшчыне, але і актыўным удзельнікам беларускага жыцьця на эміграцыі. Сходы, імпрэзы, мэмарандумы... Янка Запруднік — адзін з тых з рухавікоў беларускай дыяспары ў ЗША, на якіх гэтае жыцьцё трымаецца.

І Янка Запруднік, і а.Аляксандар Надсан — дзьве вежы беларускага жыцьця на эміграцыі. Зычым ім трываласьці і доўгіх гадоў жыцьця.

**Алег Гардзіенка**

# Што трэба памятаць кожнаму беларусу

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

Чым больш часу аддзяляе нас ад памятных сакавіцкіх падзеяў, тым менш застаецца адзнакаў уздыму і аптымізму, які выклікала плошча Каліноўскага. У тыя дні многім здавалася, што мы сталі сьведкамі пачатку новага адліку ў гісторыі краіны, новай старонкі барацьбы за свабоду, пачатку рэвалюцыі духу. Рэчаіснасьць, аднак, пачынае прыносіць куды больш песымістычныя сьведчаньні. Замест пачатку зьмен Беларусь відавочна вяртаецца ў сонны, апатычны стан, зь якога яе толькі ненадоўга вывелі выбары.

Відавочны спад грамадзянскай актыўнасьці. Некалькі тыдняў пасьля Сакавіка на запале яшчэ праводзіліся акцыі, у першую чаргу флэшмобы. Як толькі ўлады адладзілі мэханізм прадухіленьня гэтых новых формаў пратэсту, актыўныя грамадзкія дзеяньні спыніліся. Прычым нават раней, чым хтосьці паспеў прызначыць іх «арганізатара і натхняльніка» ў выглядзе флэшмоб-цэнтру. Уладзе спатрэбілася менш часу і высілкаў на прэвэнтыўныя дзеяньні, чым яе апанэнтам нават на рэфлексію. Спробы абудзіць балота, такія, як галадоўка маладафронтаўцаў, патанулі ў інфармацыйным вакууме. У выніку незалежнаму грамадзтву зноў не ўдалося пазьбегнуць пасьлявыбарнай апатыі — яе прыход толькі адцягнуўся на некалькі тыдняў.

Гэтаксама не ўдалося пазьбегнуць крызісных тэндэнцый унутры палітычнай апазыцыі. Аб расколе дэмакратычнай кааліцыі не заяўлена, але яго праявы відавочныя. Абвастрылася барацьба за лідэрства. Ідэя аб стварэньні агульнанацыянальнага дэмакратычнага руху амаль пахаваная.

Самае галоўнае, пытаньне «Што далей?» дагэтуль застаецца адкрытым. Стратэгічныя мэты дэмакратычных сілаў так і не былі вызначаныя. Калі ня вызначаныя мэты, няма і рэальнага пляну дзеяньняў.

Нельга сказаць, што ўзровень апатыі і праз 100 дзён пасьля Плошчы параўнальны з тым, які быў у 2001 годзе. Ёсьць і працягваюцца добрыя праявы салідарнасьці і ўзаемадапамогі. Ёсьць імкненьне палітычных лідэраў далей езьдзіць па рэгіёнах. Ёсьць дробныя прыватныя ініцыятывы, якія ажыцьцяўляюцца без аглядкі на апазыцыйных лідэраў. Аднак няма ліхтара ў канцы тунэлю, хай і слабенькага. **Няма кропкі на гарызонце, якую бачылі б партыйныя і беспартыйныя, арганізаваныя і неарганізаваныя, працуючыя ў рэале і ў віртуале, тыя, хто жыве ў Менску, у рэгіёнах і за мяжой. Няма нават маленькай, хай і не зусім рэальнай, але структурызаванай надзеі. Бяз гэтага дэмакратычны супраціў асуджаны на сумбурныя, разьяднаныя і ўсё менш выніковыя дзеяньні адзінак ці маленькіх групаў.**

У цэлым, пачуцьцё безнадзейнасьці вяртаецца ў сьвядомасьць самых заўзятых аптымістаў. Ці можна пераадолець гэтую апатыю? Ці магчыма ўвогуле ў цяперашняй Беларусі палітычная дзейнасьць?

Апазыцыйная палітычная сіла звычайна канцэнтруецца на двух напрамках дзейнасьці. Першы — гэта барацьба за ўладу. Другі — гэта папулярызацыя ў грамадзтве палітычнай альтэрнатывы, што ў сваю чаргу надае апазыцыі сацыяльны рэсурс, які і робіць магчымым барацьбу за ўладу. У нашым грамадзтве гэты попыт абмяжоўваецца ня толькі страхам удасканаленай за 12 гадоў рэпрэсіўнай машыны. Рэжым Лукашэнкі здолеў дасягнуць пэўнай раўнавагі паміж самім сабой і грамадзтвам, з аднаго боку «падагнаўшы» яго пад свой капыл, з другога — заклаўшы сьветапогляд і палітычную культуру сярэднестатыстычнага беларуса ў свой уласны падмурак. Дасягненьне такой раўнавагі адлюстроўваецца ў пэўных тэндэнцыях грамадзкага жыцьця, якія сталі асабліва заўважнымі апошнім часам.

Найперш гэта карпаратызацыя грамадзтва.

Дзяржава прадыктавала грамадзяніну ясны альгарытм узаемадзеяньня і аформіла яго інстытутамі й мэханізмамі (такімі, як прэзыдэнцкая вэртыкаль, кантрактная сыстэма, разьмеркаваньне студэнтаў і г.д.), якія яна цалкам кантралюе. Яна выпрацавала сыстэму ўзаемаабмену, якая выразна тлумачыць, што і як трэба рабіць дзеля задавальненьня сваіх патрэбаў. Як вынік, чалавек мусіць выбудоўваць свае жыцьцёвыя і кар’ерныя пляны, прымаць рашэньні (куды пайсьці вучыцца ці рабіць, як выплаціць крэдыт на жыльлё і г.д.) у поўнай адпаведнасьці зь існымі правіламі гульні. Наступствам падобнай карпаратызацыі зьяўляецца тое, што жаданьне чагосьці большага, чым «чарка і скварка» (прэстыжнай працы, добрага заробку, ліцэнзіі на канцэртную дзейнасьць, магчымасьці займацца бізнесам, напрыклад), можа рэалізавацца толькі пры ўмове ня проста прыманьня правілаў гульні, а актыўнага спрыяньня іх мацаваньню. Такім чынам дзяржава вэрбуе да сябе на службу цэлы сацыяльны пласт, які ў іншых умовах, пры існаваньні шырокіх зонаў асабістай і грамадзкай аўтаноміі ды легальных магчымасьцяў для незалежнай дзейнасьці, ствараў бы сацыяльную базу прыхільнікаў пераменаў. Нагадаю, што сярод тых, хто стаяў у чорных радах спэцназу альбо ствараў вядомыя сюжэты на БТ падчас сакавіцкіх падзеяў, большасьць складалі маладыя людзі.

**Вырвацца за межы лукашэнкаўскай сыстэмы могуць дазволіць сабе нямногія. Чалавек ня толькі прыстасоўваецца да сыстэмы, ён робіцца яе ўдзельнікам.** За 12 год я ня памятаю такой гатоўнасьці канфармістаў браць удзел у палітычных рэпрэсіях і такога масавага ператварэньня «кухоннай апазыцыі» ў канфармістаў.

У выніку любыя альтэрнатыўныя грамадзкія дзеяньні абмежаваныя рамкамі сацыяльнай і інфармацыйнай рэзэрвацыі. Пытаньні палітычнай стратэгіі, тэхналёгій, мэсыджу, выбару кандыдатаў і нават кааліцыйнага будаўніцтва другасныя, пакуль альтэрнатыўная палітычная дзейнасьць вядзецца ў межах рэзэрвацыі.

Раней, калі палітычны клімат у краіне

быў менш рэпрэсіўны, можна было крытыкаваць апазыцыю за сьвядомае замыканьне ў паралельным грамадзтве. Сёньня іншага выбару няма. Болей таго, адміністрацыйны і інфармацыйны кантроль дзяржавы над грамадзтвам у бліжэйшы час яшчэ больш узмоцніцца. А значыць, межы рэзэрвацыі яшчэ больш звузяцца.

## Беларускі парадокс: апазыцыя ёсьць, а палітыкі няма.

Валер Булгакаў нядаўна трапна вызначыў, чаму ва ўмовах «карпаратыўнай дзяржавы» дагэтуль дазваляецца фармальнае існаваньне палітычнай апазыцыі. «Чым больш я назіраю за паводзінамі нашай улады, тым больш я пераконваюся ў тым, што апазыцыю Лукашэнка дазваляе толькі дзеля таго, каб у Беларусі ўсё было як у людзей. Апазыцыя — гэта зьява, якая яшчэ нейкім чынам збліжае нас з суседнімі краінамі Ўсходняй Эўропы. Ня будзе апазыцыі — і Беларусь відавочна ператворыцца ў сярэднеазіяцкую дзяржаву».

Палітычная апазыцыя пакуль што існуе, а магчымасьцяў займацца палітычнай дзейнасьцю больш не засталося.

Інстытуцыйны стан апазыцыі фактычна не зьмяніўся з тых часоў, калі паўсталі палітычныя суб’екты, — з больш лагодных, плюралістычных часоў. Атрымалася, што форма цалкам не адпавядае жыццю. Падзелы на палітычныя партыі, звады паміж лідэрамі, спробы вызначыць «свой электарат», падзяліць яго на «правы і левы» падобныя да рэфлексаў у чалавека, у якога нядаўна ампутавалі нагу ці руку. У іх гэтая канечнасьць нейкі час працягвае «балець»: іншымі словамі, адчуваньне ёсьць, матэрыяльнага аб’екту няма.

У новых умовах трэба было б пераасэнсаваць свае мэты й задачы, а таксама зьмяніць інстытуцыйныя рамкі сваёй дзейнасьці, рэканструяваць іх пад новыя рэаліі, якія ня зводзяцца да барацьбы за ўплыў той ці іншай партыі або ідэалёгіі. Аднак зрабіць гэта амаль немагчыма. Практычна нерэальна, напрыклад, зарэгістраваць новую арганізацыю, партыю, рух, а стварац незарэгістраваную — значыць рызыкаваць трыма гадамі ў турме нават перад тым, як пачнеш актыўную дзейнасьць.

Інстытуцыйны застой непазьбежна выклікае дэфіцыт ідэяў. БНФ бачыць шлях у наладжваньні масавых акцыяў з мэтай патрабаваньня новых выбараў.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ
**Плошча Каліноўскага была змаганьнем за гонар, а не за ўладу.**

АГП прапануе збор подпісаў за адмену кантрактнай сістэмы, за дэлегітымізацыю прэзыдэнцкіх выбараў, правядзеньне кампаніі «Салідарнасьць дзеля Свабоды», а таксама падрыхтоўку да мясцовых выбараў.

На жаль, можна адзначыць відавочны дэфіцыт рэпэртуару і няздольнасьць вынесьці навуку з папярэдніх беспасьпяховых кампаній такога кшталту. Такое адчуваньне, што прапануецца гонка за цягнікам, які ўжо пайшоў, асабліва што тычыцца дэлегітымізацыі адбытых выбараў. Выбары можна дэлегітымізаваць толькі тады, калі яны адбываюцца, а не праз некалькі месяцаў, калі грамадзтва ўжо забылася, што яны наагул былі. Калі пачынаць сёньня, то дэлегітымізаваць можна хіба што выбары 2011 году.

Відавочная адсутнасьць стратэгічнага бачаньня. Незразумела, які будзе працяг, што рабіць пасьля таго, як мітынгі будуць разагнаныя, а подпісы недасабраныя.

Маштабныя палітычныя задачы, аб якіх гавораць лідэры, могуць рэалізавацца толькі нашмат больш магутнымі палітычнымі, фінансавымі, інфармацыйнымі і арганізацыйнымі рэсурсамі, чым тыя, якія сёньня мае апазыцыя.

Варта дадаць, што спробы правядзеньня падобных акцыяў рабіліся і ў мінулым, а іх вынікі былі несуцяшальнымі.

Праблема шырэйшая, чым крызіс жанру ў апазыцыі. Ва ўмовах немагчымасьці кантраляваньня базавых працэсаў, што адбываюцца ў дзяржаве і грамадзтве, палітычная апазыцыя робіцца закладніцай абставінаў, мусіць пры самых сваіх актыўных дзеяньнях спадзявацца на цуд, на форс-мажор ці на натуральны ход падзеяў, які можа заняць балюча шмат часу. Яна ня можа даць аніякіх гарантыяў, што самыя эфэктыўныя індывідуальныя і калектыўныя дзеяньні прынясуць плён, што яны ня будуцьануляваныя прэвэнтыўнымі захадамі ўлады. Разам з хвастом мінулых няўдачаў гэта ператварае безнадзейнасьць у руціну: паразы, няўдачы пачынаюць успрымацца як данасьць.

Ва ўмовах, калі безнадзейнасьць стала руцінай, калі актыўныя дзеяньні трапляюць пад артыкулы Крымінальнага кодэксу, калі ўлада загадзя мае адказ амаль на любыя выклікі з боку апанэнтаў, адзіная сіла, якая застаецца непадкантрольнай і непераадольнай для ўлады, гэта сіла бясьсільных. Захаваньне надзеі на пабудову іншае Беларусі ў будучыні залежыць ад таго, ці будзе працяг у рэвалюцыі духу, пачатак якой мы ўбачылі на плошчы Каліноўскага.

Падтрыманьне і пашырэньне дысыдэнцкай грамадзкай актыўнасьці ёсьць неабходнай перадумовай для таго, каб у будучым узьнікла сур’ёзная палітычная альтэрнатыва. Такая дзейнасьць шмат у чым розьніцца ад палітычнай — яна больш індывідуальная і, калі так можна сказаць, дробнагрупавая, чым калектыўная і палітычная. Яна ладзіцца больш з уласнай ініцыятывы, чым па плянах і стратэгіях. Яна, нарэшце, праводзіцца на свой страх і рызыку — гарантыяў абароны ад ціску, шантажу і рэпрэсіяў сёньня даць ніхто ня можа.

Сёньня як ніколі патрэбнае пашырэньне і мацаваньне тэрыторыі свабоды — дэмакратычнай субкультуры, калі

Працяг на старонцы 10.

# Што трэба памятаць кожнаму беларусу

Працяг са старонкі 9.

хочаце — палітычнага гета. Пошук новых формаў «існаваньня ў свабодзе» ўжо вядзецца незалежнымі высілкамі — і пашырэньне ўплыву палітычнага Інтэрнэту ёсьць адной зь відавочных праяваў.

Карысьць для Беларусі можна прыносіць і не зацыкліваючыся на палітыцы. Летні адпачынак, заўзятарства, краязнаўчыя экскурсіі, любая іншая непалітызаваная і дэбюракратызаваная форма аб'яднаньня аднадумцаў (апошняе — дэбюракратызацыя — сёньня асабліва важна, каб зьменшыць пагрозу крымінальнага перасьледу) могуць быць нашмат больш плённымі, чым любыя заклікі далучыцца да наступнай палітычнай кампаніі.

Тэрыторыя свабоды ня здольная выжыць без салідарнасьці і ўзаемадапамогі. Зьменшыць кошт існаваньня ў паралельным грамадзтве можна толькі супольнымі высілкамі ўсіх яго сяброў. Самая простая дапамога тым, хто трапляе пад дзяржаўны каток, ці іхным сем'ям — ахвяраваньне невялікіх грошай ці часу, каб дапамагчы ў побытавых пытаньнях. Маральная падтрымка сёньня значыць больш чым калі. Тое самае тычыцца і больш шырокага грамадзтва. Трэба навучыцца заступацца за любога пакрыўджанага, наладжваць кантакты зь любымі аўтаномнымі асяродкамі, перапісаць талмуды сваіх праграмаў у некалькі радкоў канкрэтных і зразумелых прапановаў і патрабаваньняў.

**Наладжваньне камунікацый з падкантрольным уладзе грамадзтвам, па-за рамкамі дэмакратычнай субкультуры, немагчыма без інфармацыйнага прарыву. Гэты прарыў сёньня можа ажыццявіцца толькі з-за мяжы.** Арганізацыя незалежнага тэлевізійнага і радыёвяшчаньня на Беларусь абмяркоўваецца і мусоліцца ўжо каторы год, але гара кожны раз параджае мыш. Існуючая на сёньня палітычная апазыцыя валодае інструмэнтамі, каб як мінімум паспрабаваць арганізаваць гэты масіўны інфармацыйны прарыў. Болей за тое, я лічу гэта галоўнай



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Дэмакратычнае змаганьне неабавязкова павінна быць палітычным.**

яе задачай на бліжэйшы перыяд — урэшце, без інфармацыі аб палітычнай дзейнасьці гаварыць не даводзіцца. Трэба памятаць, аднак, што патрэбна менавіта інфармацыя для грамадзянаў, а не трыбуна для таго ці іншага палітыка або працоўнае месца для таго ці іншага «свайго» журналіста.

Быць дысыдэнтам ва ўмовах карпаратыўнай дзяржавы ўсё ж параўнальна

лёгка. Стратэгія будуецца з шэрагу дробных справаў. Можна проста займацца тым, чым займаесься, — пісаць артыкулы, друкаваць кнігі і часопісы, рабіць інтэрнэт-сайты, размаўляць зь людзьмі...

Палітычнай апазыцыі нашмат складаней. Патрэбны мэты, патрэбны вынікі. Патрэбна сьвядомая рызыка, больш высокі ўзровень самаахвярнасьці, патрэбныя здольнасці, каб пераканаць іншых ісьці на ахвяры, амаль нічога не абяцаючы ўзамен. Сьпіс аб'ектыўных прычынаў, па якіх палітычная апазыцыйная дзейнасьць сёньня можа быць толькі малаэфэктыўнай, доўгі. Але калі палітычная апазыцыя зьмірыцца з аб'ектыўнымі прычынамі, яна канчаткова ператворыцца ў частку дысыдэнцкага асяродку. Толькі што дысыдэнтам па азначэньні не патрэбныя лідэры й начальнікі. Яны патрэбныя тады, калі зьяўляецца мэта, пэрспэктыва.

**Пры ўсіх сваіх недахопах існаваньне арганізаванай апазыцыі дапамагае захоўваць надзею, што палітычны прарыў магчымы. У гэтым яе, калі хочаце, сацыяльная значнасьць. Але апазыцыя можа быць запатрабаваная грамадзтвам толькі як пратаганіст пераменаў, а не як праваднік партыйных інтарэсаў і ідэалёгіяў.** Партыйным актывістам даўно пара ўсьвядоміць, што правы й левы, лібэральны й кансэрватыўны электараты ў Беларусі зьявяцца толькі тады, калі адродзіцца публічная палітыка. Прасоўванне асобных ідэалёгій, праграмаў, лідэраў толькі паглыбляе адчужэньне паміж апазыцыяй і незалежным грамадзтвам. Калі застаюцца палітычныя партыі, неабходна любымі высілкамі захаваць аб'яднаўчыя інстытуты, такія, як кааліцыя і Кангрэс дэмакратычных сілаў.

Палітычныя лідэры мусяць усьвядоміць, што падпарадкаваць грамадзянскую актыўнасьць у сёньняшніх умовах немагчыма. Дысыдэнтам не патрэбны рэгістрацыя, офісы і шмат чаго іншага, яны могуць існаваць дэцэнтралізавана. Калі ўзьнікне канкурэнцыя паміж апазыцыяй і грамадзкім сэктарам, першая непазьбежна прайграе. Наадварот, існаваньне палітычнай апазыцыі сёньня хутчэй апраўдваецца тым, якія паслугі яна можа аказаць незалежнаму грамадзтву. Тое, чым палітыкі мусяць займацца ў бліжэйшы час, — гэта таксама зьбольшага грамадзкая, а не палітычная дзейнасьць.

Любое высьвятленьне адносінаў, любыя канфлікты, зьвязаныя з барацьбой


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Ня выключана, што палітычная дзейнасьць у бліжэйшы час будзе магчымая толькі ў дысыдэнцкіх формах.**

за лідэрства, сёньня дыскрэдытуюць увесь дэмакратычны рух. Скліканьне новага Кангрэсу дэмакратычных сілаў, перагляд раскладу сілаў унутры кааліцыі, вызначэньне новых лідэраў мэтазгодныя толькі тады, калі ўсе ўдзельнікі аб'яднаньня будуць гатовыя прызнаць яго вынікі без скандалаў, кулюарнай барацьбы і абструкцыі.

Падзеі на плошчы Каліноўскага засьведчылі мабілізацыйны патэнцыял ілюзіі. Бессэнсоўныя выбары ўрэшце мелі пэўны сэнс, калі нехта захоўваў хай сабе наіўную надзею на тое, што яны могуць штосьці зьмяніць. У гэтым і палягае сэнс удзелу апазыцыі ў выбарах. Аднак трэба памятаць, што ўдзел у выбарах мае сэнс толькі тады, калі кожная кампанія — мясцовая ці парлямэнцкая — зьяўляецца падрыхтоўкай да паўстаньня новай плошчы Каліноўскага падчас заканчэньня кампаніі прэзыдэнцкай.

Рэалізацыя буйных палітычных стратэгіяў ва ўмовах татальнага кантролю, актыўных прэвэнтыўных дзеяньняў рэжыму і існаваньня ў рэзэрвацыі маларэальная.

Пытаньне аб уладзе падчас палітычнай кампаніі 2006 году не стаяла ні да яе пачатку, ні ў канцы. Сцэнар, скапіяваны з украінскага, мог ажыцьцявіцца толькі тады, калі барацьба за ўладу ня несла фізычнай пагрозы яе ўдзельнікам.

«Крызісу ўлады», аб якім апавядаў Мілінкевіч, пакуль насамрэч не назіраецца. Наадварот, улада выйшла з апошніх палітычных падзеяў кансалідаванай. Яе крызіс магчымы толькі тады, калі рэсурсы, неабходныя для падтрыманьня адміністрацыйнага і эканамічнага кантролю над грамадзтвам ды ляяльнасьці ўласнага бюракратычнага і адміністрацыйнага апарату, згаснуць альбо радыкальна зьменшацца. Менавіта тады ўзьнікне попыт на палітычную альтэрнатыву, а палітычная апазыцыя атрымае магчымасьць вырвацца з рэзэрвацыі.

Апазыцыя няздольная прысьпешыць гэты працэс. Яна здольная, аднак, прадбачыць ці спрагназаваць магчымыя сцэнары яго. Яна мусіць быць гатова да магчымага крызісу ўлады ня толькі ў арганізацыйным аспэкце, але і ў ідэалягічным. Крызіс ператвараецца ў палітычныя магчымасьці толькі для таго, хто здольны інтэрпрэтаваць яго прычыны і прапанаваць гэтую інтэрпрэтацыю грамадзтву.

У любым выпадку, дэмакратычная апазыцыя і незалежнае грамадзтва пакуль застаюцца закладнікамі безнадзейнасьці. Варыянт таго, што дэмакратычны супраціў у найбліжэйшы час будзе магчымы выключна ў дысыдэнцкіх формах, выключаць нельга. Індывідуальны супраціў — гэта самае галоўнае ў такіх абставінах. Варта памятаць, што ён непазьбежна прынясе плён, што канструкцыя карпаратыўнай дзяржавы ня вечная. Дысыдэнт усё ж мае адну перавагу, якую не здольныя адняць ніякія рэпрэсіі, — ён бачыў і ведае, як руйнуюцца дыктатуры.

**Гэты тэкст — урыўкі з артыкулу В.Сіліцкага «Памятаць, што дыктатуры руйнуюцца», поўны варыянт якога быў зьмешчаны ў «ARCHE» №7—8 за гэты год (arche.bymedia.net/2006–7/silicki706.htm).**

# 120 000 кілямэтраў



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

Гэта ў Магілёве ўсё мераюць на кілямэтры. «Тры кілямэтры шчасьця», — казалі мне пра маладую беларускамоўную сям'ю, у якой нарадзіўся сын. «О-о, дзесяць кілямэтраў праблемаў», — так у двух словах аналізуюць стан справаў у мясцовай дэмакратычнай кааліцыі. «Яму да патрыёта сто кілямэтраў», — а гэта пра вядомага земляка, які апошнім часам усё часьцей гаворыць пра незалежнасьць. І ўдакладняюць: «Паўзком. На каленях».

Цяпер у Магілёве на «хіміі» сядзіць маладафронтавец Артур Фінькевіч. Самага маладога палітвязьня штодня прыходзяць падтрымаць магілёўцы, прыяжджаюць менчукі. Чытаю пра гэта і згадваю, як пару гадоў таму адзін з тамтэйшых адраджэнцаў безнадзейна махнуў рукой: «Э-э, ды тут нікому нічога ня трэба. Усе самі сабе, хата з краю. Якая салідарнасьць, пра што ты гаворыш... Дзе яна?» — і дзьмухнуў у паветра, і разьвёў рукі ў бокі: няма.

Год адседкі на лесанарыхоўках — самы час, каб спраўдзіць, ці існуе беларуская салідарнасьць. Зьмерыць яе ў Малым Сітне. Па-магілёўску — у кілямэтрах.

Кожны візыт, кожны госьць, хто й адкуль, у мяне ў асобным сшытку запісаны. Больш за 260 чалавек. Лічу, колькі праехаў каторы зь іх — сюды й дахаты, — падсумоўваю і атрымліваю неверагодную лічбу 120 000 кілямэтраў.

Тры зямныя экватары! Беларускай салідарнасьцю ў адным асобна ўзятым выпадку і толькі за год, аказваецца, можна тройчы абярнуць зямны шар!

Нават з найбліжэйшага Полацку дасюль далекавата — 50 км. Але менавіта полацкая салідарнасьць усе гэтыя месяцы давала мне і хлеб надзённы, і духовую ежу.

Міждэнамінацыйная дэлегацыя полацкіх хрысьціянаў (праваслаўны, каталік ды ўніят з уніяткаю) завезла сюды бульбы й гародніны, а ў дадатак і ката Партызана. Сябры незалежнага прафсаюзу «Шкловалакно» ці не штомесяца прыяжджалі з пакункамі харчу ды вопраткі, арганізатары агратурызму зь Мёраў — зь вясковымі прысмакамі. Лідэры мясцовай апазыцыі Аляксей Трубкін ды Васіль Главацкіх забясьпечвалі газэтамі. Каталіцкая пісьменьніца Ірына Жарнасек прывозіла посную ежу ды вітаміны. Грэка-каталікі перадавалі рэлігійную літаратуру. Самым жа частым госьцем быў пісьменьнік Вінцэсь Мудроў зь нязьменным «свабодаўскім» дыктафонам.

Віцебская салідарнасьць, у сваю чаргу, дамагалася для мяне адпачынкаў і арганізоўвала транспарт. Немагчыма апісаць, колькі разоў бацькі падымалі на вушы ветрынскую, полацкую і віцебскую міліцыю пасьля кожнага парушэньня ці абмежаваньня маіх правоў. Падчас аднаго з такіх вэрхалаў уражаны опер са спэцкамэндатуры прызнаўся: «Самая моцная партыя, Павал Канстанцінавіч, — партыя бацькоў». Сябра сям'і Вадзім Баршчэўскі, Хрыстафор Жэляпаў, лідэр абласнога Фронту Кастусь Смолікаў штораз садзіліся ў машыны ды ехалі да Сітна. Валер Шчукін (пасьля якога любога барадатага наведніка сустракаюць захопленыя воклічы сіцэнцаў: «О! Аляксеіч!»), Яраслаў Берніковіч з Глыбокага, каталіцкія, уніяцкія, пратэстанцкія сьвятары з Полацкага ды Лепельскага раёнаў зрабіліся ў Малым Сітне ўжо сваімі.

Больш за ўсё наведнікаў было зь Менску. Сталічная салідарнасьць арганізавала ў глухой лясной вёсцы агмень цывілізацыі. Рэдакцыя «Нашай Нівы» прывезла сюды побытавую тэхніку ды аптэку лекаў; генэрал Фралоў — тэлевізар, маладафронтаўцы — радыёпрымач; дэлегацыя беларускага ПЭН-цэнтру на чале з

## ХРОНІКА

### 25 ліпеня: Статкевіча хочуць падлавіць

Да ўладальнікаў і работнікаў маршрутак, што трымаюць галадоўку ў Берасьці, далучыліся індывідуальныя прадпрымальнікі **Вячаслаў Кухарчук** і **Віктар Чайкоўскі** — на знак салідарнасьці. Агулам у акцыі ўдзельнічаюць 15 чалавек.

Палітвязьня **Міколу Статкевіча** баранавіцкія міліцыянты прымусова праверылі на ўтрыманьне алькаголю ў крыві.

**Анжаліку Борыс** выклікалі на допыт у Ленінскае РУУС Горадні: сьледчага цікавіла, чаму ў Польшчы яна называе сябе кіраўніцай Саюзу палякаў Беларусі.

Берасьцейскі гарвыканкам забараніў раней дазволены **мітынг 27 ліпеня**, дазнаўшыся, што на яго прыедзе А.Мілінкевіч.

Беларускія міліцыянты ўварваліся ў кватэру супрацоўніка латвійскага пасольства **Рэймаса Шміца** і канфіскавалі відэакасэты. Пазьней міністар Навумаў заявіў, што на іх была парнаграфія, а МЗС Латвіі — што запісы інфармацыйна-аналітычных праграмаў БТ.

У Салігорску падчас распаўсюду ўлётак затрыманыя **Іван** і **Ільля Шылы**, а таксама актывіст Партыі БНФ **Павал Батуеў**.

### 26 ліпеня: Елавая спусьцілася на вяроўцы

Аўтамабіль **Аляксандра Мілінкевіча** затрымалі ў Полацкім раёне, калі ён ехаў да палітвязьня Паўла Севярынца, на падставе наяўнасьці ў машыне друкаваных матэрыялаў. У машыне былі таксама **Іна Кулей**, **Павал Мажэйка** і **Аляксей Янукевіч**. Пасьля складаньня пратаколу Мілінкевіч усё ж пасьпеў наведаць ссыльнага.

Да арышту прысудзілі расейцаў **Мікалая**

# салідарнасьці

Уладзімерам Някляевым, Лявонам Баршчэўскім, Уладзімерам Коласам ды Ўладзімерам Арловым — цэлую бібліятэку мастацкай літаратуры; ініцыятыўная група БХД — кубамэтар кансэрваў (састаўлены ў масіўную вежу проста на падлозе, ён яшчэ доўга выклікаў у сіценцаў сьвятарнае трапятаньне: «А што, Амэрыка ўсіх, хто ў вашай партыі, так забясьпечвае?!»). Падзеі Плошчы, быццам на тэлеэкране, мне паказвалі запісаныя фільмам на ноўтбуку... Вячаслава Сіўчыка, які сябры з «Бацькаўшчыны» прывезьлі разам са сьвяточным сталом (!). Доўга сьмяяліся з прапановы занесьці такі сэрвіс у рэестар паслугаў МУС... Сіценцы й алешчынцы хаваліся ад камэры Юр'я Хашчавацкага, унікалі аб'ектыву фотаапарата Пётры Васілеўскага, скардзіліся на начальства ў мікрафоны Генадзя Барбарыча, Тацяны Мельнічук ды Аляксандра Старыкевіча; узгадвалі, што кніжкі Арлова стаяць у іхняй бібліятэцы, і ня верылі, што гэта ходзіць па лузе ён сам. Маладафронтаўцы й зуброўцы — гурбы камуфляжнае моладзі зь бел-чырвона-белымі значкамі ды шаўронамі — пакідалі ўражаньне, што ў вёску ўвайшоў сапраўдны беларускі партызанскі атрад і ўлада перамянілася.

Ну, а як сустракалі Аляксандра Мілінкевіча (кавалькада зь некалькіх машынаў, каманда суправаджэньня на чале зь Сяргеем Калякіным, фотаўспышкі) — лепш за ўсё сьведчаць вынікі алешчынскіх праймэрыз, дзе адзіны атрымаў 70% галасоў супраць 10% у Лукашэнкі. Падчас другога, нядаўняга візыту сп.Аляксандру ў вёсцы проста не давалі праходу: прасілі дапамагчы з рамонтам хаты, падняць леспрамгас, павысіць заробкі...

*Панаехала гасьцей* і з астатніх абласьцей. Эвангельскі пастар з Койданава цэлы дзень чакаў мяне з Полацкай царквы; мае дзядзькі з Гомельшчыны дабіраліся сюды двое сутак; берасьцейскія маладафронтаўцы арандавалі мікрааўтобус, каб ехаць 700 кілямэтраў праз усю краіну, а гарадзенцы на чале з Паўлам Мажэйкам прывезьлі з сабою польскую тэлевізію (адзін зь мясцовых п'янтосаў, падняўшыся з канавы, растапырыў рукі й крычаў апэратару: «Здымай! Я тут жыву!..»).

А хто-ніхто дабіраўся сюды й з-за мяжы. Пратэстанты-прадпрымальнікі ехалі з Кіева, каб абмеркаваць беларускую палітычную сытуацыю. Французскія й амэрыканскія журналісты рабілі кола зь Менску, каб пацікавіцца быццём сіценскай глыбінкі. Прадстаўніку Швэцыі ў Беларусі Стэфану Эрыксану, каб перадаць мне кнігі, давялося езьдзіць у Сітна двойчы — першы раз узімку яго разьвярнулі ўжо ў вёсцы, і толькі праз паўгоду, захаваўшы інкогніта, ён здолеў пранікнуць у засакрэчаныя гушчары беларуска-расейскай інтэграцыі. Пасьля візыту беларускіх студэнтаў, якія працуюць у Капэнгагене й чые нумары на аўтамабілі мяцовыя віжы зблыталі зь нямецкімі, у навакольлі быў абвешчаны сапраўдны алярм: «Немцы ў лесе!» Ледзь не дайшло да апэрацыі «Баграціён»...

Межаў артыкулу ня хопіць, каб пералічыць усіх, хто праехаў паўкраіны, каб выказаць сваю салідарнасьць. А яшчэ ж былі сотні лістоў ды пасылак — спадзяюся напісаць пра іх у наступным нумары.

Дарагія людзі! Вялізны дзякуй вам усім! Адведзіны Сітна пераконваюць: беларуская салідарнасьць здольная накарміць, апрануць, абараніць і натхніць кожнага, хто трапіў пад удар рэжыму.

Калісьці, у часы Майсея, Бог вызначыў габрэйскаму народу меру шляху да зямлі абяцанай. Свая такая мера, палічаная ў днях і кілямэтрах, пэўна, ёсьць і ў нас. Сьведчу: за апошні год толькі праездам праз Сітна беларусы яшчэ на 120 тысячаў кілямэтраў наблізіліся да нацыянальнага абуджэньня.

*в.Малое Сітна*

Беларуская салідарнасьць здольная накарміць, апрануць, абараніць і натхніць кожнага, хто трапіў пад удар рэжыму.

## ХРОНІКА

**Збарашэнку** (15 сутак) і **Кацярыну Вінакураву** (10 сутак): 22 ліпеня яны пікетавалі расейскае пасольства ў Менску.

У кватэры **Тацяны Елавой** узламалі дзьверы. Пры гэтым сама Тацяна здолела вылезьці з кватэры, што знаходзіцца на шостым паверсе, па вяроўцы. Маці Т.Елавой, таксама **Тацяну**, ад кватэры забрала «хуткая»: у больніцы ёй паставілі дыягназ «нэйрацыркулярная дыстанія».

У кватэры сёстраў **Алены** і **Кацярыны Казак** правяліператрус і ў КДБ на допыт забралі гаспадыняў. У Алены ў момант затрыманьня была тэмпэратура 39 градусаў, дома адны засталіся трое яе дзяцей (старэйшаму сыну 11 гадоў, малодшай дачцэ 5 гадоў).

У **Тацяны Дзядок** правялі ператрус у яе адсутнасьць: канфіскавалі архіўныя ўлёткі, газэты, дыскі з музыкай Бізэ і «Бітлз».

Усе гэтыя допыты й налёты можна зьвязаць з імкненьнем КДБ раскрыць удзельнікаў руху «Бунт».

На вуліцы затрымалі **Яўгена Бабковіча** і завезьлі ў ГУУС Менгарвыканкаму. **Кірылу Ігнацiку** на вуліцы ўручылі позву туды ж на 27 ліпеня.

Пачаўся суд у справе недзяржаўнай газэтай **«Витебский курьер М»**: прадпрымальнік Аляксандар Данілаў лічыць, што выданьне абразіла яго, напісаўшы, што ён атрымаў зямлю пад пабудову Цэнтру моладзевага адпачынку бяз тэндэру і конкурсу.

У Горках на двое сутак арышту асуджаны **Дзям'ян Франкоўскі** — за нясвоечасовую выплату штрафу ў 20 базавых велічыняў; штраф на яго наклалі за распаўсюд «Народнай волі».

**Працяг на старонцы 14.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Артура Фінькевіча, высланага на прымусовыя работы ў Магілёў, упершыню адведала мама Марыя (на фота другая зьлева).**

**Працяг са старонкі 13.**

### 27 ліпеня: Дзень Незалежнасьці

У Магілёве падчас сьвяткаваньня Дня Незалежнасьці затрыманыя **Ірына Качарова, Сяржук Нягацін, Сяргей Стральцоў, Аляксандар Сілкоў, Сяржук Гіркін, Ганна Ільліна, Натальля Палякова**.

У Віцебску затрымалі **Алену Залескую, Веру Кавалёву** і **Ўладзімера Сіманковіча**: іх зьвінавацілі ў арганізацыі шэсьця.

У Салігорску падчас конкурсу малюнкаў да Дня Незалежнасьці затрымалі моладзевых актывістаў **П.Батуева**, братоў **Шылаў, Глеба Сандраса, Дзяніса Карнова, Андрэя Тычыну, Міхала Грузьдзя** і **Барыса Пархамчука**.

У Клецку міліцыянты дапыталі актывіста АГП **Сяргея Панамарова**: іх цікавіла, ці мае ён дачыненьне да труны, знойдзенай у адным з грамадзкіх месцаў гораду. У труне ляжала пудзіла з гармонікам з акцыі «Пахаваньне прадпрымальніка».

У Гомелі ў пракуратуру хацелі выклікаць моладзевага актывіста **Сержука Сямёнава**: міліцыянт перадаваў бацькам позву на сына. Аднак бацькі яе не ўзялі, бо хлопец прапісаны ў іншым месцы. Выклік тычыцца дзейнасьці ліквідаванага ўладамі моладзевага цэнтру «Гарт».

У Менску падчас вывешваньня расьцяжкі «Бунт» затрыманыя **Кацярына Фурса** і **Наста Чахоўская**.

На эколяга **Валера Дранчука** падчас яго паездкі ў Белавескую пушчу склалі пратакол: яго зьвінавацілі ў парушэньні рэжыму асабліва ахоўных прыродных тэрыторыяў.

### 28 ліпеня: суд «Партнэрства»

Пачаўся суд над актывістамі незарэгістраванай арганізацыі «Партнэрства» — **Энірай Браніцкай, Мікалаем Астрэйкам, Аляксандрам Шалайкам, Цімохам Дранчуком**. На закрытым судовым працэсе не дазволілі прысутнічаць ні сваякам, ні дыпляматам з краінаў Эўразьвязу і ЗША, ні журналістам.

### 31 ліпеня: шукаюць Скрабутана

Калегія па грамадзянскіх справах Магілёўскага аблсуду пацьвердзіла рацыю актывіста прафсаюзу РЭП Магілёўскага заводу штучнага валакна **Ўладзімера Тузава**: месяц таму ён выйграў суд першай інстанцыі ў сувязі зь незаконным утрыманьнем яго прэміі.

У Зэльвенскую пракуратуру выклікалі маці **Яўгена Скрабутана**: памочнік пракурора цікавіўся, дзе цяпер хлопец. Найхутчэй выклік зьвязаны з крымінальнай справай «Маладога фронту».

**АШ**




**Апазыцыйны актывіст Дзяніс Дзянісаў, які зьнік у Менску 22 ліпеня, аб'явіўся ў Расеі 23-га. Цяпер ён вярнуўся ў Беларусь. Дагэтуль немаведама, што ж сапраўды зь ім здарылася. На фота: Дзяніс Дзянісаў са сваёй каляжанкай Тацянай Дзядок. На наступны дзень пасьля таго, як яна напісала заяву пра зьнікненьне Дзяніса, да яе на кватэру прыйшлі зьператрусам.**

# Справаздача Камітэту ў абарону рэпрэсаваных «Салідарнасьць»

Камітэт у абарону рэпрэсаваных» Салідарнасьць» пачаў працу 5 красавіка 2006 г. Яго стварэньне было рэакцыяй на рэпрэсіі супраць грамадзянаў, якія публічна выказвалі сваю пазыцыю падчас прэзыдэнцкай кампаніі 2006 г. На гэтым тыдні ў Рэдакцыю надышоў ліст з інфармацыяй пра дзейнасьць гэтай ініцыятывы.

Вось вытрымкі зь яго:

«За тры месяцы дзейнасьці ў Камітэт у абарону рэпрэсаваных «Салідарнасьць» зьвярнуліся 678 чалавек:

— студэнты — 372 чалавекі,

— беспрацоўныя, — 122 чалавекі,

— спэцыялісты, якія маюць патрэбу ў пасьлядыпломнай адукацыі, — 41 чалавек,

— спэцыялісты, якія жадаюць прайсьці стажыроўку па сваёй спэцыяльнасьці, — 17 чалавек.

— грамадзяне, якія маюць патрэбу ў мэдычнай рэабілітацыі і матэрыяльнай падтрымцы, — 126 чалавек.

Канкрэтная дапамога аказана наступным катэгорыям рэпрэсаваных:

1. З 1 чэрвеня 2006 г. 233 студэнты, выключаныя з ВНУ, абітурыенты зь ліку рэпрэсаваных школьнікаў і дзяцей рэпрэсаваных актывістаў пачалі навучаньне ў межах Праграмы імя Кастуся Каліноўскага ў Польшчы.

2. Падрыхтаваны прапановы на працяг навучаньня студэнтаў і спэцыялістаў, што маюць патрэбу ў пасьлядыпломнай адукацыі:

— Чэхія — 12 чалавек,
— Нямеччына — 10 чалавек,
— Эстонія — 7 чалавек,
— Нарвэгія — 3 чалавекі,
— Францыя — 2 чалавекі,
— Украіна — 17 чалавек.

Працягваецца шчыльнае супрацоўніцтва з амбасадамі Чэхіі, Эстоніі і Украіны па вызначэньні кандыдатур на працяг адукацыі ў вышэйназваных краінах. Фармуецца база прапановаў для амбасады Румыніі ў адпаведнасьці з праграмай румынскага ўраду.

3. Фармуецца сьпіс з 70 чалавек, што маюць патрэбу ў часовым працаўладкаваньні ў будаўнічай кампаніі ў Польшчы.

4. Заключана дамоўленасьць з грамадзкімі арганізацыямі Чэхіі і Польшчы аб прыняцьці на стажыроўку па спэцыяльнасьці 10—20 чалавек адпаведна.

5. За кошт сродкаў, вылучаных прадстаўнікамі розных канфэсіяў у Мінску, аказана матэрыяльная падтрымка 12 рэпрэсаваным.

6. Сябры пратэстанцкай супольнасьці ўзялі пад апеку 25 сем'яў рэпрэсаваных, якія знаходзяцца ў цяжкім фінансавым становішчы.

7. Трое дзяцей рэгіянальных актывістаў 10—14 год накіраваны ў беларуска-італьянскі інтэграцыйны летнік у Радашкавічах.

8. Ёсьць папярэдняя дамоўленасьць з амбасадай Украіны аб вылучэньні 10 месцаў у санаторыях краіны для мэдычнай рэабілітацыі рэпрэсаваных.

9. Былі падрыхтаваныя і адпраўленыя больш за 100 лістоў у межах кампаніі «Салідарнасьць» з мэтаю аказаньня маральнай падтрымкі сем'ям рэпрэсаваных.

10. Былі праведзеныя 5 сустрэчаў са сваякамі палітвязьняў.

11. Была аказана асабістая падтрымка актывістам дэмакратычнага руху: перададзены 20 кнігаў з аўтографамі Ўладзімера Арлова, Вольгі Іпатавай, Радзіма Гарэцкага і 5 дыскаў ад Лявона Вольскага.

12. Ліст-зварот сваякоў рэпрэсаваных да кіраўнікоў дзяржаваў — удзельнікі саміту G8 у Санкт-Пецярбурзе быў перададзены ў адпаведныя амбасады.

13. Была праведзеная прэс-канфэрэнцыя па праблеме ліста-звароту да лідэраў G8».



# Каму паслугуе атамны джын

Будаўніцтва АЭС можа перакінуць масток між Беларусьсю і Захадам. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Выступаючы ў аўторак перад айчыннымі дыпляматамі, афіцыйны лідэр даў зразумець, што будаўніцтва атамнай станцыі — пытаньне вырашанае. Гаворка ідзе, маўляў, пра энэргетычную бясьпеку і ня толькі.

Увогуле ж, заўважце, ня першы месяц рыхтуецца псыхалягічная глеба пад запуск праекту, выключна адчувальнага для постчарнобыльскай краіны. Больш таго, у вачох Захаду гэтая краіна — перадусім «апошняя дыктатура Эўропы».

Тут можна згадаць, што раней беларускі кіраўнік не аднойчы шкадаваў аб страце савецкіх ядзерных ракетаў. А ў красавіку ў Брагіне шматзначна сказаў, што каб мы мелі АЭС, то ў сьвеце да нас ставіліся б іначай.

Як толькі папаўзьлі чуткі пра пляны збудаваць станцыю, былы дэпутат Уладзімер Парфяновіч пачаў біць у званы, папярэджваючы пра небясьпеку «Паўночнае Карэі ў Эўропе», «шантажу суседзяў і ўсяго сьвету паводле прыкладу Пхеньяну», «ператварэння беларусаў ў ядзерных закладнікаў».

Захад пакуль што назірае за сюжэтам збольшага моўчкі. Чаму? Вайсковы экспэрт Аляксандар Алесін мяркуе, што, як ні парадаксальна, Менск і Захад акурат тут могуць і паразумецца. Бо і Лукашэнка, і Эўропа заклапочаныя расейскім энэргетычным дыктатам. Будаўніцтва АЭС магло б стаць выгаднай замовай, напрыклад, для французаў. Масква прапаноўвае таньнейшы праект, але ж пасьля таго, як расейская ракета сапсавала наша трыюмфальнае ўступленьне ў клюб касьмічных дзяржаў, сто разоў падумаеш, ці патрэбна нам іхняе фірмовае «дешево и сердито».

Натуральна, супрацоўніцтва з Захадам магчымае пры пільным кантролі над беларускай атамнай праграмай з боку міжнародных інстытуцыяў. Дарэчы, МАГАТЭ, марачы пра ўзмацненьне сваіх пазыцыяў, цалкам можа праявіць тут зычлівасьць, кажа Алесін.

Такім чынам, на атамнага джына можна глядзець па-рознаму — і як на страшную пагрозу, і як на добрага служку.

Перад апазыцыяй, як падаецца, узьнікае дылема. З аднаго боку, узмацненьне энэргетычнай незалежнасьці — гэта бясспрэчны плюс. Разам з тым, змагарам супраць рэжыму неяк нелягічна ігнараваць Парфяновічавы аргумэнты...

Апроч таго, ёсьць і сумневы чыста эканамічнага кшталту, дадае аналітык Валер Карбалевіч. Дый сацыялёгія сьведчыць, што бальшыня беларусаў не падтрымліваюць ідэі свайго «мірнага атаму». Прычым цікава, што сярод Лукашэнкавых прыхільнікаў доля праціўнікаў АЭС нават большая. Хіба не спакусьліва згуляць на электаральным полі дзейнага



ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

кіраўніка?

Аб’яднаныя дэмакраты пакуль што не выпрацоўвалі пазыцыі адносна АЭС, паведаміў мне Вінцук Вячорка. Сам жа ён лічыць, што такое сур’ёзнае пытаньне мусіць вырашацца галосна дэмакратычным урадам.

Слушна, але ж мы жывём у іншай Беларусі, і пытаньне пра мірны атам стаіць рубам менавіта цяпер. Улада згенэравала свой плян, добры ці кепскі. А яе палітычныя апанэнты зноў запазьняюцца з рэакцыяй, не гаворачы ўжо пра гульню на апярэджаньне. Так вось і жывём.

**Прошча ў цэнтры беларускай сталіцы.**



# На заметку беларускаму Архімэду



Касьмічныя прыгоды «БелКА» адкрылі ў грамадзтве дыскусію: куды накіраваць розумы нашых вучоных — у космас, на службу мірнаму атаму, а можа... Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

Уважліва прачытаўшы Ягоны апошні сьпіч перад дыпляматамі, зразумеў, што нам патрэбна абсалютна новае пакаленьне прылад і тэхналёгій, якія маглі б служыць нашым сапраўдным інтарэсам. Нават уявіў дыялёг у беларускім павільёне на нейкай навуковай выставе:

— Добры дзень, тут прадстаўлены апошнія навінкі беларускай навукі?

— Вэлком, гутэн таг, добры дзень! Магу прапанаваць вам некалькі эксклюзіўных распрацовак. Вось, напрыклад, «замежнапалітычны прагматызатар»

— Гэта ж пыласос!

— Самі вы пыласос! Прылада пабудавана на прынцыпе залежнасьці замежнай палітыкі ад інтэнсіўнасці патокаў нэйтронаў і пратонаў. Уключаем прагматызатар у сетку. Адчуваеце, як прагматызуецца ваша замежная палітыка ў радыюсе двух мэтраў? Можна паставіць на максымум — дзесяць мэтраў. На жаль, гэта пакуль усё, аднак экспэрымэнты працягваюцца.

— Добра, а вось там што? Хакейныя наплечнікі?

— Гэта «палітычны гібкатар» — накладаецца вось так на плечы. Калі нехта спрабуе паляпаць вас па плячы, б’е токам, ілюструючы словы Бацькі: «Мы нічога не рабілі дзеля паляпваньня па плячы». Пагадзіцеся, вельмі зручна.

Ідзём далей. Ага! «Антынацкоўшчык» Гэта спэцыяльна для сустрэчаў з грамадзянамі СНД, каб, гаворачы Яго словамі, ня даць «нацкаваць друг на друга». Рэч накшталт намордніка. Глядзіце, я надзеў яго, і цяпер, нават калі вы будзеце прадаваць мне газ па 200 баксаў, мяне на вас не нацкаваць. Ну што, выпісваць?

— Не, дзякуй.

— Ну, тады выключна для вас «геапалітычны зацікаўлівач»: шляхам шматлікіх экспэрымэнтаў даказана, што, калі ў такім скафандры і такіх ластах прыйсьці на дыпляматычны раўт, вамі зацікавяцца ўсе прысутныя. Гэта ня ўсё: калі вы набываеце геапалітычны зацікаўлівач, то кампанія-вытворца дае вам у падарунак прыладу — «антыдвухстандартны адэкватар». Вось бачыце гэтую пімпачку? Яна называецца «наша пазыцыя па пытаньнях двухбаковага супрацоўніцтва у гандлёвай і транзытна-транспартнай сфэрах». Калі круціць вось гэтую ручку, яна адэкватна падкарэктуецца. Пагадзіцеся, супэр.

Пачакайце, куды вы?.. Я ж яшчэ не паказаў вам «фарміравальнік пазытыўнага іміджу», пабудаваны паводле прынцыпу кававаркі! Дзівак!.. Што сказаць — застаўся ў мінулым стагодзьдзі.

# Аўтастопам да Швайцарыі

Швайцарцы ня дбаюць ні пра вопратку, ні пра касмэтыку. Затое яны, як дзеці, радуюцца кожнай магчымасьці даведацца пра новае ці зрабіць дабро. А яшчэ яны дбаюць пра наяўнасьць лаўкі ў кожным месцы, зь якога адкрываецца прыгожы краявід. Праз Познань, Аахен, Парыж і Бургундыю **Юліян Гайдук** і **Ціна Палынская** даехалі самаспынам да Швайцарыі.



**Развалы букіністаў уздоўж Сэны (Парыж).**

У маладосьці падарожнічаюць дзеля таго, каб вучыцца, у старасьці — каб адпачываць. Прынамсі, натоўпы старых у шортах пасярод разьвешаных у Люўры палотнаў Леанарда сьведчаць пра тое. Ды, насамрэч, кожнай зьяве — сваё прызначэньне. Выпраўляючыся самаспынам ў Швайцарыю да сяброўкі Элы Скаруліс, удавы вядомага беларускага праваабаронцы Арсеня Скаруліса, мы ведалі, што ў падарожжа няма іншай мэты, як дарога.

### Хутар у крэдыт

Правёўшы першую «замежную» ноч на спальніку пад зоркамі ў крывавай бойцы зь цярэспальскімі камарамі, у сутоньні наступнага дня нечакана трапляем у госьці да новых сяброў. Шыман і Мадзя праскочылі нас на вялікай хуткасьці, вярнуліся, і, пакуль мы ўладкоўваліся, яны ўтаймоўвалі свайго вялікага сабаку, тлумачачы, што самі абышлі Эўропу спынам...

Гаспадары жывуць на тым, што ў нас прынята лічыць хутарам. Купка вялікіх бела-шкляных катэджаў даўно спачывае — апроч пані, якая штовечар дае Мадзе сьвежае малако. Мадзя цяжарная, тры дні таму яны з Шыманам пашлюбаваліся, а праз тры месяцы яна народзіць сына. Шымана побач ня будзе — ён зьедзе на заробкі ў Англію.

> Заходнія кіроўцы ня спыняцца, калі не прачытаюць твой пункт прызначэньня на самаробнай шыльдачцы.

Двухпавярховы дом са шкляной гасьцёўняй ды вялікай тэрасай, джып-пазадарожнік — усё гэта атрымана ў крэдыт. Выплаты расьцягнуцца на шмат гадоў, але працаваць у Ангельшчыне Шыману прыйдзецца не па сваёй гуманітарнай спэцыяльнасьці.

У Шымана з Мадзяй эўрапейская звычка прымаць гасьцей — забясьпечыўшы вячэрай ды ложкам, яны сыходзяць наверх, паклапаціўшыся ўдакладніць, дзе можна паліць. Ранкам мы атрымліваем трускаўкі ў дарогу й фатаздымак з адрасам.

### Пяць эўра на каву

Паклаўшыся спаць ля трасы за Познаньню, разумееш, што такое мяжа. Бясконцы паток велікагрузаў з ровам плыве на захад. Адчуваньне, што ідзе вайна.

Нямеччына. У краявідзе не засталося нічога польскага — чырвоная цэгла мажных пуняў зьмяніла польскую кветкавую легкадумнасць, а шпілі кірхаў заместа звыклых касьцельных контураў змушаюць міжволі падціснуць вусны, настройваючы на культ стрыманых эмоцыяў. Угаварыць якога кіроўцу перавезьці празь мяжу ня надта проста — ніхто ня пэўны, што мы з гастарбайтэраў, у якіх усё ў парадку з дакумэнтамі. Урэшце нейкі пан зацікаўліваецца — хто ж мы за людцы такія? Глядзіць у мапу ды радуецца, што правязе нас аж 600 км. Амаль праз усю Нямеччыну.

Разьвітаньне з панам нечакана разьвязвае языкі. Мы ўжо ведаем, што замежны стоп — не «савецкі», і справа ня толькі ў тым, што па аўтабане хадзіць нельга. Руйнаваньне стэрэатыпу пра абыякавасьць і самазамкнёнасьць заходніх людзей адбываецца адначасова з разуменьнем прыроды іхняе гасьціннасьці: яны сапраўды ня спыняцца, калі не прачытаюць твой пункт прызначэньня на самаробнай шыльдачцы — альбо не пачуюць ад цябе, чаго ты ад іх хочаш. А пачуўшы, зробяць максымум магчымага. Нават падарыць 5 эўра на каву. Мы зьдзіўляліся жаданьню даць грошы валацугам з Вайс-Русьлянд і нязьменнай таксе ў 5 эўра — кошту двух кубкаў напою на паркінгу. Гэта ўсё ад жаданьня выказаць захапленьне людзьмі, якія паперліся глядзець Парыж з аддаленай у прасторы і часе «краіны Люкашэнка».

### Уменьне падтрымліваць размовы

Суботнім вечарам па-

межным з Бэльгіяй Аахенам пазначаецца ўяўленьне пра рознакаляровасьць сьвету. Дзіўнаваты араб на адкрытым «кадылаку» спачатку адмаўляецца нас падвозіць, але, паназіраўшы за намі гадзіны з паўтары («дальнабоі» змогуць прадоўжыць шлях толькі ў панядзелак), сам жа падзывае. Мы зрываемся ў ноч, і ўсіх накрывае расчараваньне — яму няма як размаўляць з намі пра чэмпіянат, бо ўся наша пра яго абазнанасьць абмяжоўваецца падабранай на дарозе трохкалернай нямецкай стужкай.

Эўрапейцы дбаюць пра наяўнасьць лаўкі ў кожным месцы, зь якога адкрываецца прыгожы краявід.

У дні футболу Эўропа дае волю эмоцыям. Практычна ўсе машыны ідуць пад сьцягамі, шмат на якіх чатыры сьцягі адразу з кожнага акна.

Араб давозіць нас да францускай мяжы. Пасьля амаль адразу нас падхопіць-возьме валагавокі каляровы хлопчык, і празь дзьве гадзіны мы апынёмся ля Аўстэрліцкага вакзалу, не разумеючы, дзе канчаецца наша стомленасьць і дзе пачынаецца Парыж.

## Тры катэгорыі кляшараў

Уначы парыскія вакзалы сьпяць, таму і Аўстэрліцкі, і Ліёнскі адразу хаваюць нашы мары пра кубачак кавы. Жыцьцё прадумана, уначы Парыж не турбуюць цягнікі. На вуліцы людзей сьвет — трэцяя гадзіны ночы, а іх ня меней, чым удзень, і ўсе яны відавочна ведаюць, куды кіруюцца. Шпацыруючы мосьцікам цераз Сэну, адразу натыкаемся на намёты кляшараў.



**На мосьце цераз Сэну.**

Тыя сьпяць, толькі капелюшы для грошай стаяць ля намётаў. Салдат сьпіць — служба ідзе.

На Ліёнскім вакзале знаходзім кляшараў, якія абыходзяцца без намётаў: яны сьпяць ці проста адпачываюць на ўмантаваных у асфальт рашотках, з-пад якіх падымаецца цяпло.

Першымі ў Парыжы прачынаюцца булачнікі. Зазіраем у вокны, што запальваюцца першымі. Зь іх — хвалі дзіўных пахаў, заклапочаныя людзі мітусяцца ля печак, першыя круасаны раскладаюцца на вітрынах, што пакрысе вызваляюцца ад начных чахлоў. Праз гадзіну пачнуць сваю справу гандляры мясам, потым пакоцяцца да столікаў двухколкі з гароднінай. Неба паружавее, калі ў кандытарскай, гаспадыня якой яшчэ распраўляе абрусы, мы ўпадабаем дзівосныя піражныя.

## Брудны чароўны горад

Пакеты са сьмецьцем гадзінамі стаяць, сьмердзючы ва ўсе бакі. Самыя гожыя дзяўчаты — чарнаскурыя, яны дагледжаныя на тле «запрацаваных» белых цётак ва ўніформе з шортаў ды простых саколак. Будучыня належыць каляровым?!

У Парыжы цяжэй за ўсё пераадолець «турысцкія спакусы» ў выглядзе даўно знаёмага сьпісу рэчаў накшталт Пон-Нёф ды Пале-Раялю. Выйшаўшы з-пад Нотр-Даму, галоўнае своечасова схамянуцца, набыць віно ды пацягнуцца піць яго з бутэлечкі пад квадратны жывот Эйфэлевай вежы, пацьвельваючыся з натоўпаў, якія стаяць у чарзе, каб падняцца па ёй уверх, не разумеючы, што пад ёй, пад ейнымі чатырма нагамі, — куды лепей. І адкінуць той сьпіс жаданага для прагляду — углядаючыся ў проста Парыж.

Самыя танныя гатэлі каштуюць 21 эўра з носа. Іх адрасоў вам, вядома, ніхто не падкажа — на іх можна адно выпадкова наткнуцца, блукаючы недзе па правым беразе, — так шчасьціць толькі сапраўды ненармальным валацугам.

## Бургундзкая гасціннасьць

У Шаблі трапляць мы не меркавалі. Што тая сталіца вінаробства, калі трэба пасьпець у час дабегчы пехам да Швайцарыі. Аднак, паміраючы ад смагі на выпаленым аўтабане, мы паразумеліся зь немаладой мадам. Тая кіравалася ў Жэнэву, але праз гасьцяваньне-начаваньне ў брата недзе ў глушы Бургундыі. Глуш звалася Шаблі.

І зноў уразіліся альгарытмам заходняй гасьціннасьці. Спачатку мы дамовіліся, што будзем спаць на сваім спальніку там, дзе мадам пакажа пальцам, пасьля, у Шаблі, набыўшы нам ежы на заўтрашні шлях (мы запозна даведаліся, што ў краіне эўра немагчыма памяняць даляры), мадам паведаміла, што пакажа нас брату. Патрык і ягоная жонка Матыльда пачалі з соку ды прапановы

**Працяг на старонцы 20.**



**У францускай правінцыі ня рэдкасьць сустрэць хату з XV ст.**

# Аўтастопам да Швайцарыі

Працяг са старонкі 19.

паставіць намёт у іх на лужку, увечары ж, наблукаўшыся вінаграднікамі, мы ўбачылі прыгатаваны для нас пакой ды атрымалі стос ручнікоў па дарозе ў лазенку. Затое... леглі спаць галоднымі. Дарма, памыўшыся, чакалі мы, што Патрык і Матыльда адарвуцца ад мундыялю ды прыгадаюць пра галодных людзей, дарма ляскалі зубамі, уяўляючы, колькі смачнага засталося ў нас ў багажніку аўто. Зранку мы атрымалі затое свойскі француcкі сьняданак ды каву з гарачым малаком.

І яшчэ адна тамтэйшая рыса. Частуючы, мадам крытычна агледзела нашы набыткі, зьдзівілася зь іх сьціпласьці, нават адабрала ў нас малако ды памяняла пляшкі на даражэйшыя, тыцаючы ў этыкетку, дзе нешта пазначалася пра ліпіды. А пасьля асобна разьлічылася за нашы прадукты ды ўрачыста ўручыла нам рахунак. Эла Скаруліс, да якой мы скіроўваліся, пазьней давяла нам, што менавіта праз рахунак на нас выдаткаванага мадам адно і магла падкрэсьліць *кошт* свайго добрага да нас стаўленьня. Каб пераканаліся, якіх менавіта грошай ёй не шкада для такіх мілых людзей. І свой мэйл яна дала, сьцьвярджае Эла, таксама не дзеля разьвітальнага рытуалу — яна сапраўды будзе чакаць ад нас лістоў на дрэннай ангельскай са справаздачай аб падарожжы ды пра жыцьцё ў Беларусі. Бо заходнія людзі — адкрытыя, як дзеці, і, як дзеці, да сівых валасоў не губляюць цікаўнасьці да сьвету.



**Дворык мастака пад Тунам.**

## Краіна на далоні

Эла кажа, што ўсе эўрапейскія гарады, нават і Менск, падобныя ў галоўным — яны створаныя для працы. Швайцарыя — выключэньне. Ускочыўшы праз тунэлі ў горныя развалы, мы, пакуль мадам прытарможвае на небясьпечных паваротах на сэрпанціне, аглядаем зьверху жывую мапу: вось Жэнэва, а вунь там Лязана. Маленькая краіна, праўда, не спрашчае перасоўваньня самаспынам, бо сетка аўтабанаў пачынаецца адразу за горадам, а паркінгаў тут ужо няма — навошта яны, калі найвялікшая адлегласьць паміж гарадамі — 30 км? Дый вялікіх заправак няма, адно маленечкія, побач з прыватным домам, з адным «агрэгатам».

Швайцарцы рана сканчаюць працоўны дзень: крамы працуюць да сёмай. Выключэньне — пятніца, калі на ўік-энд усе старанна затарваюцца да дзявятай, бо ў выхадныя ў прадаўцоў адпачынак, як і ва ўсіх людзей. А звыклыя нам установы накшталт «чэйндж» увогуле працуюць толькі зранку.

Эла жыве ў маленькай вёсцы зь вялікім супэрмаркетам. Ёсьць і іншыя крамы, розныя там сэкцыі фірмаў-гігантаў, але туды нам нецікава. Супэрмаркет у вёсцы, думаецца, зьмяняе настрой вясковага жыцьця: навошта імкнуцца кудысьці, калі ў сваёй краме можна набыць усё, што лучыць цябе са сьветам? А вось паштоўкі з краявідамі Ватэнвілю прадаюцца адно ў гемайдзе — «сельсавеце».

Краіну сыру ўражвае тым, як апранаюцца людзі. На жыхарах самай багатай краіны сьвету дамінуюць… тыя самыя шорты ды бясформенныя майкі. Вопратка тут сапраўды значыць мала!

## Ніякай касмэтыкі

Нашых людзей дзесяцігодьдзямі вучылі таму, што духоўнае павінна ў чалавеку пераважаць над «мяшчанскім». Выглядаць абыяк ды ганарыцца сваім унутраным сьветам мы так і не навучыліся, а заходнія людзі прыйшлі да гэтага самі — праз дабрабыт.

Эла кажа: навошта купляць модную вопратку заместа старой зручнай, калі ты ведаеш, што *можаш* гэта зрабіць? З парогу яна ўражвае нас непадробным зьдзіўленьнем, калі мы просім прас, — як, навошта, тут ніхто не прасуе адзеньня,



дый нашы «найлепшыя» саколкі падаюцца ёй вычварнымі: навошта такія прыгожыя апранаць, у іх жа сьпякотна. Касмэтыкай тут таксама ніхто не карыстаецца.

На жыхарах самых багатых краінаў сьвету дамінуюць простыя самыя шорты ды белыя майкі. За вопраткай тут ня гоняцца.

Фрызура — адзінае бездакорнае ва ўсіх кабетаў. Чым тады, міжволі зьдзіўляемся, дзяўчаты тут спыняюць позіркі хлапцоў, калі яны цалкам адмовіліся ад таго, каб дбаць пра выгляд?

Выходзіць, што выключна сабой, тым самым унутраным сьветам, што б'ецца ва ўсьмешцы ды бляску вачэй.

А яшчэ эўрапейцы дбаюць пра наяўнасьць лаўкі ў кожным месцы, зь якога адкрываецца прыгожы краявід.

## Сьвечка на бальконе

Гномікі, званочкі, кветкі ля сядзібаў — таксама працілегласьць нашай звычцы нагрувашчваць на падаконьні хатнія расьліны. Нікому ня прыйдзе ў галаву ўлетку трымаць іх у хаце — усё вонкі, каб упрыгожвалі сьвет.

«Індывідуальных» дамоў мала: зямля дарагая, таму кожная сядзіба — «шматкватэрная», на тры-чатыры сям'і. Гмах, у якім жывуць эмігранты, — адзіны бяз гномаў ды бяз кветак. Эла яшчэ не пасьпела пражыць тут столькі, каб адчуць сябе швайцаркай, дый клопат пра малых адбірае час, а суседзі з Шры-Ланкі — людзі іншай культуры.

З Элаю дзьве ночы запар — «дзявочнік» са сьвечкаю на гаўбцы. Мэлёдыя званочкаў спаўзае з Альпаў з усіх бакоў, — ад пачатку мы не зразумелі, што за архітэктурны цуд так чароўна няспынна звоніць. А гэта каровы на выпасах. Статкі мігруюць па гарах суткамі, у кожнай каровы на шыі — званочак. Жыцьцё каровы скончыцца, і ейным званочкам гаспадар упрыгожыць гаўбец ці кухню... або невялічкі бар, калі ён ягоны ўладар. Званочкі не змаўкаюць ні на хвіліну, мы перастаём іх чуць адваротным шляхам, падабраўшыся бліжэй да Базэлю, падзеленага паміж трыма краінамі. Жыцьцё пад званочкі асабліва ўражвае ў начным халадку, калі вяршыні гор зьнітоўваюцца цёмнымі аблокамі…

А чацьвёртай ночы разыходзімся. Дзівімся: Элка, ты кажаш, што няшмат размаўляеш з тутэйшымі, бо яшчэ не навучылася *супольнаму* зь імі маўленьню. Але паміжсобку яны пра нешта размаўляюць гадзінамі: глядзі, вакол, на суседніх тэрасах, вунь там і вунь там, таксама чырвоныя, жоўтыя сьвечкі ня гаснуць да ранку. Там жа пра нешта таксама цячэ гутарка! Элка сьмяецца — што вы, там нікога няма. Там даўна паклаліся спаць, у Гельвэцыі рана кладуцца. Сьвечку проста пакінулі на стале на тэрасе, каб было прыгожа. Навошта? Гаспадары ж сьпяць, і ніхто ня пройдзе па вуліцы цягам ночы. Усё адно. Яны *ведаюць*, што гэта прыгожа, і пакідаюць сьвечку. Няхай сьвеціць зоркам.

Ідзём у горы. Элка распавядае, што Арсень купляў ёй файнае віно ў пляшцы з крывым рыльцам… Арсень загінуў, упаўшы з гары, на якой захацеў паставіць бел-чырвона-белы сьцяг на Дзень Волі.



Мэлёдыя званочкаў пануе над Альпамі.


У Швайцарыі растуць беларускамоўныя Агата і Альгерд.

## Наша музыка

Пасьля нямецкага воцату ды швайцарскага малака ва ўсім хочацца дахаты. Дахаты — гэта ў Польшчу. Хочацца гаварыць *проста*, не шукаючы пакутліва патрэбныя словы чужых моваў. Хаця ўжо прызвычаіліся казаць «грусэр» усім, каго сустракаем на вуліцы. У Ватэнвілі, як і ў беларускай вёсцы, усе вітаюцца з усімі. Толькі тут вітацца трэба хутчэй, бо ўсе, каго сустракаем, — на роварах. Сум па Польшчыператвараецца ў звычайны голад, бо Нямеччыну пераадольваем не харчуючыся: шкада рэшты грошай на «воцат», калі наперадзе — польскія кілбаскі.

Пра Радзіму ня думаецца — яна нечакана накрывае нас сама, калі, ад'ехаўшыся трохі ад нямецкага памежжа, спыняем «дальнабоя», пытаемся «ў бок Познані», і ён вязе нас да Цярэспалю, да мяжы. Ён гойдае галавой, слухаючы пра падарожжа, кажа: мабыць, даўно ня чулі нашай музыкі — і ставіць «Уладзімерскі цэнтрал». Кілбасак болей ня хочацца. Каб назойлівы голас Круга не змушаў ванітаваць, даводзіцца напружана прыгадваць *іншае*. Напрыклад, Адамовічава «Ты ведаеш, а сьвет яшчэ пякнейшы...».

**Фота аўтара**

# Не такі Крым страшны, як яго малююць



АРЦЁМ ЛЯВА

Газэта «Беларусь сегодня» 21 ліпеня на першую паласу вынесла матэрыял пра адпачынак у Крыме. Аўтарка матэрыялу Алена Нікольская цягам усяго артыкулу апэлюе да Інтэрнэту, неназваных расейскіх газэтаў і свайго знаёмага, пішучы пра страшэнную дарагоўлю крымскага адпачынку. Не па кішэні, маўляў, простаму беларусу, «звыкламу да сьціплых выдаткаў на адпачынак», жытло ад 30 да 300 тыс. рублёў, просьценькія абеды па 16 тыс., экскурсіі ад 24 да 100 тысячаў. У выніку аўтарка патрыятычна рэзюмуе: «Лепш за ўсё — на Браслаўскія азёры. Таньней і прыемней!»

Гэтая публікацыя зачапіла нашага чытача Паўла Абрамовіча, які толькі што вярнуўся з Таўрыі.

«Цэны, якія растуць не па днях, а па гадзінах, — гэта мана. Беларусы, як і ўсе эўрапэйцы, даўно навучыліся пралічваць усё наперад, і ніхто не паедзе сёньня за сьвет, ня ведаючы сытуацыі і ўмоваў адпачынку», — зазначае Павал. Абрамовічы здымалі кватэру з усімі выгодамі за 15 хвілінаў хады ад мора. Каштавала гэта 15 даляраў з чалавека за суткі. «Варта растлумачыць, што кошты на жытло тут узрастаюць у сэзон — жнівень—верасень, але гэта не характэрна для ўсяго летняга пэрыяду. Таму той, хто захоча таньней, можа абраць для адпачынку пачатак лета, калі жытло ўдвая таньнейшае».

Ня мела нараканьняў сям'я сп. Абрамовіча і да харчаваньня: «Прадукты ў крамах калі не таньнейшыя, то й не даражэйшыя за нашы. Вельмі прыстойны асартымэнт малочных прадуктаў, кілбасаў. Увогуле тут асартымэнт прадуктаў шырэйшы, чым беларускі, і фасаваньне разнастайнае». Харчаваліся Абрамовічы ў гарадзкой кавярні, у сталоўцы санаторыю «Крым», і паўсюль іх прыемна ўражвалі як памеры порцыяў (як зьесьці!), іх добры смак, так і цэны — зусім не жахлівыя, як палохаюць свае ды расейскія мэдыі. Добры абед на чатырох чалавек абыходзіўся ім у пераліку ў 12—16 тыс. рублёў. Да слова, гарбату тут прапануюць «вялікую» і «малую» — 0,5 і 0,2 л адпаведна. Пляшка белага нефільтраванага піва таксама цешыць непараўнальным зь беларускімі коштам — каля тысячы рублёў.

Не падаўся занадта дарагім і актыўны адпачынак — гадзіна ў дэльфінарыі на тэрыторыі санаторыю «Крым» для дарослых каштуе 9 тыс., для дзяцей да 7 гадоў бясплатна. Экскурсія па партэіцкай бухце каштавала даросламу крыху больш за 11 тыс., для дзяцей да 7 гадоў ізноў жа бясплатна. Той жа пляжны парасон можна нядорага набыць на месцы — гэта будзе выгадней, чым штодня браць на пракат.

«Турагенцыі ды Інтэрнэт даюць вычарпальную інфармацыю пра месцы адпачынку, і кожны мае магчымасьць сплянаваць свой адпачынак згодна з уласнымі патрабаваньнямі і фінансавымі магчымасьцямі. Мы адпачылі акурат на тую суму на якую і разьлічвалі, у гэтым абышлося безь сюрпрызаў» — падкрэсьлівае П.Абрамовіч.

**Нішто не заменіць сонца і марской вады.**

Артыкул, зазначае Павал, патыхае выразнай дзяржзамовай на стварэньне нэгатыўнага вобразу Украіны. «Але, пры ўсіх патрыятычных пачуцьцях, беларускія азёры не заменяць тым беларусам, што едуць у Крым, марскога клімату і гораў, — цьвердзіць ён і дадае: — Мы і абралі Крым, пасёлак Партэіт, з тым, каб прагрэць дзяцей. Чаго ня зробіш тут».

Ад сябе дадамо інфармацыю, атрыманую ад турагенцыі «Цэнтар-курорт». Кошт пражываньня на базах адпачынку «Слабодка» і «Золава» на Браслаўскіх азёрах складае ад 14 690 да 32 600 руб. з чалавека за суткі.

**Сямён Печанко**

# Беларускія праекты Рады Эўропы

Распрацоўваецца праект стварэньня ў Літве камунікацыйнай плятформы для Беларусі.

Рада Эўропы — гэта міжнародная палітычная арганізацыя, заснаваная ў 1949 годзе, якая складаецца з прадстаўнікоў 46 эўрапейскіх краінаў. Гэта больш шырокае аб'яднаньне, чым Эўразьвяз. Усе сябры Эўразьвязу ўваходзяць і ў Раду Эўропы. Але ў склад РЭ ўваходзяць і такія краіны, як Расея, Украіна, Малдова, Грузія, Армэнія, Азэрбайджан, якія не ўваходзяць ў Эўрапейскі Зьвяз. Увогуле ж, з эўрапейскіх краінаў адна толькі Беларусь у РЭ не ўваходзіць — за парушэньні дэмакратыі і правоў чалавека яе пазбавілі нават статусу спэцыяльна запрошанае краіны.

## Мэты

У якасьці асноўных мэтаў старэйшай міждзяржаўнай арганізацыі можна вылучыць тры наступныя: гэта абарона правоў чалавека, распаўсюд агульных эўрапейскіх дэмакратычных стандартаў і ўсталяваньне прынцыпу верхавенства закону на тэрыторыях краінаў — удзельніц Рады Эўропы. Рада Эўропы таксама спрыяе выпрацоўцы краінамі-ўдзельніцамі агульнага заканадаўства ў сфэры права, сацыяльнай і юрыдычнай практыцы, развіцьцю эўрапейскай самабытнасьці, заснаванай на супольных каштоўнасьцях і разнастайнасьці культур эўрапейскіх народаў.

## Кірунак

На практыцы выходзіць, што асноўным кірункам дзейнасьці РЭ ёсьць распаўсюд і пашырэньне дэмакратычных каштоўнасьцяў Старога Сьвету на посткамуністычныя краіны, дапамога такім краінам у палітычным, заканадаўчым рэфармаваньні. Складаецца, на першы погляд, уражаньне, што хтосьці папраўляе сьвечкі ў чужой бажніцы. Насамрэч гэта ня так. Рада можа сачыць за працэсамі дэмакратызацыі, выкананьнем правоў чалавека, уплываць толькі на тыя краіны, якія пажадалі далучыцца да РЭ і ўзялі пры ўступленьні ў арганізацыю на сябе пэўныя абавязкі.

Дзеля справядлівасьці варта адзначыць, што Рада Эўропы не абмяжоўвае сябе барацьбой за дэмакратыю ў Эўропе. Гэтак, эўрапейцы актыўна выступаюць супраць парушэньня правоў чалавека ў ЗША — у пытаньнях пакараньня сьмерцю, утрыманьня палонных у Гуантанама або транспартаваньня асобаў, падазраваных у тэрарызьме.

## Структура

РЭ разьмяшчаецца ў Страсбургу.

Парлямэнцкая Асамблея Рады Эўропы, якая склікаецца на тыдзень кожныя тры месяцы, складаецца з 630 прадстаўнікоў нацыянальных парлямэнтаў 46 краін і дзьвюх краін — кандыдатак на далучэньне да Рады Эўропы. Да 1997 году парлямэнт Беларусі меў статус спэцыяльна запрошанага ў ПАРЭ.

Старшыня ПАРЭ — Рэнэ ван дэр Ліндэн. Генэральным сакратаром арганізацыі ёсьць Тэры Дэвіс. Сакратарыят складаецца са спэцыялізаваных дырэктаратаў (па палітыцы, праве, правох чалавека, сацыяльнай еднасьці, адукацыі і культуры ды інш.) і аддзелаў. Дзьвюхпалатны Кангрэс мясцовых і рэгіянальных уладаў РЭ складаецца з прадстаўнікоў нацыянальных мясцовых уладаў. Чацьвертай істотнай інстытуцыяй ў структуры Рады ёсьць Эўрапейскі суд па правах чалавека.

Камісарам РЭ па правах чалавека, які сочыць за выкананьнем правоў у краінах-удзельніцах, ёсьць Томас Хамэрбэрг. Акрамя камісарыяту, існуюць іншыя мэханізмы маніторынгу выкананьня краінамі РЭ ўзятых забавязаньняў. Структура Рады Эўропы фінансуецца на кошт унёскаў краінаў-сяброў. Бюджэт арганізацыі ў 2006 годзе складае крыху болей за 190 мільёнаў эўра.

Калі некалькі краінаў падпісваюць пагадненьне (канвэнцыю альбо хартыю) аб супрацы ў пэўнай сфэры дзейнасьці, ствараецца камісія ці камітэт з прадстаўнікоў ад розных краінаў. Пагадненьне можа быць частковае (калі яго падпісалі ня ўсе краіны РЭ), абавязковае для ўсіх краінаў Рады Эўропы (напрыклад, Эўрапейская канвэнцыя па правах чалавека), пашыранае (калі да яго далучаюцца краіны па-за РЭ).



АРЦЁМ ЛЯВА

Так, Беларусь да гэтай пары ёсьць падпісантам Культурнай канвэнцыі Рады Эўропы, што дазваляе нашай краіне быць паўнавартасным удзельнікам кампаніі «Ўсе розныя — усе роўныя», якую распачаў дырэктарат па адукацыі, культуры, пытаньнях моладзі і спорту на сэсіі ПАРЭ ў канцы чэрвеня. Наша краіна таксама асацыяваны сябар Вэнэцыянскай камісіі, якая спэцыялізуецца на юрыдычных пытаньнях у сфэры канстытуцыйнага ды выбарчага заканадаўства. Праўда, у 1997 годзе сяброўства Беларусі заблякавана, і ўсе кантакты у гэтай сфэры спыненыя.

## Беларусь у Эўропу

У РЭ дастаткова праціўнікаў ізаляцыі Беларусі. За аднаўленьне афіцыйных кантактаў на сёлетняй сэсіі ПАРЭ горача выступала расейская дэлегацыя. Старшыня Парлямэнцкай асамблеі, які ўжо меў размову са сьпікерам палаты прадстаўнікоў Канаплёвым, выказаўся пра магчымасьць візыту ў нашу краіну ў верасьні, калі будзе афіцыйнае запрашэньне. Такі намер старшыні вітаў у сваёй прэсавай канфэрэнцыі сьпікер верхняй палаты расейскага парлямэнту Сяргей Міронаў. Эўропа чакае Беларусь. Яна шукае шляхі, а значыць — рычагі ўплыву, з дапамогай якіх можна было б палепшыць сытуацыю ў Беларусі, але усё ж, паводле словаў Тэры Дэвіса, не зьбіраецца мяняць сваёй ацэнкі беларускіх выбараў і стаўленьня да цяперашняга беларускага кіраўніцтва.

Структуры Рады Эўропы ўвесь час падтрымліваюць кантакты з прадстаўнікамі недзяржаўных арганізацыяў Беларусі. Так, Канфэрэнцыя міжнародных няўрадавых арганізацыяў Рады Эўропы ладзіць паседжаньні з удзелам беларускіх НДА, распрацоўвае праект па стварэньні ў Літве камунікацыйнай плятформы для Беларусі. Дырэктарат па адукацыі запрашае беларускую моладзь удзельнічаць у кампаніі «Ўсе розныя — усе роўныя». Дырэктарат па палітычных пытаньнях ладзіць у ліпені ў Страсбургу Ўнівэрсытэт дэмакратыі, куды запрошаны 9 прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці Беларусі. Вэнэцыянская камісія спрабуе супрацоўнічаць зь беларускім Канстытуцыйным судом праз Канфэрэнцыю эўрапейскіх канстытуцыйных судоў.

**Арцём Лява**

За больш дэталёвай інфармацыяй пра жыцьцё Эўропы зьвяртайцеся да ўэб-бачынаў http://www.belarus-europe.info/ і www.belarus-europe.info.

Тэлепраграма «Акно ў Эўропу» трансьлюецца на канале RTV і праз кабэльнае тэлебачаньне штонядзелю а 17-й і з паўторам у панядзелак (а 5.00), аўторак (12.00), чацьвер (5.00) і суботу (2.00).

Штотыднёвая радыёпраграма «Акно ў Эўропу» трансьлюецца па Эўрапейскім радыё для Беларусі на частотах AM і FM, праз спадарожнік і ў Сеціве а 8-й раніцы (AM: AM: 612 kHz, спадарожнік: 11013 Mhz, Сеціва: http://www.belradio.fm/, www.belradio.fm/, FM: 103.4 а 5.40).

Гэтыя праграмы фінансуюцца Эўракамісіяй.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Музычны крытык Вітаўт Мартыненка сабраў увесь беларускі рок пад адной вокладкай.**

# Што чуецца, пра тое і пішацца



**Мартыненка В., Мяльгуй А. 222 альбомы беларускага року і ня толькі...** — Менск. Медысонт, 2006. — 448 стр.з іл.

Кніга складаецца з рэцэнзій двух музычных журналістаў, надрукаваных за апошнія дваццаць гадоў у айчыннай прэсе.

Сьціплай старонкі зьместу пры канцы яўна не хапае для таго, каб зарыентавацца ў чатырох сотнях старонак. Няма паказьніка па прозьвішчах і назвах — няясна, дзе шукаць таго ці іншага выканаўцу. Зрэшты, і самі аўтары пазыцыянуюць выданьне як «кнігу-экспэрымэнт».

Аўтары ўзялі толькі друкаваныя раней матэрыялы і нічога адмыслова для кнігі не дапісвалі. Таму адчуваецца часавая прарэха ў надта цікавы пэрыяд — 1994—1997 гады (Вітаўт і Анатоль тады адышлі ад музычнай журналістыкі). Адпаведна, колькі альбомаў альбомаў «Крамы», «Новага неба» ды іншых папросту выпалі з кнігі. Рэцэнзій на альбомы «Rouble Zone», Шадзька, «Ляпіса Трубяцкога», «Drum Ecstasy» і да т.п. у кнізе таксама не сустрэнеш. Для аўтараў галоўны крытэр выбару — беларуская мова. Хоць незразумела, за што пацярпелі бубначы-інструмэнталісты. Вітаўт у прыватнай размове растлумачыў, што ў іх ніводнага слова па-беларуску на вокладцы дыску не напісана. Чаму тады адрэцэнзаваны такі самы ў аздабленьні альбом гурту «Князь Мышкін»? Няясна. А што рабіць зь «Ляпісамі», якія ўзялі ды засьпявалі на «Залатых яйках» пару песень пабеларуску (як і прысутны тут «Нэйра дзюбель» прыкладна ў гэты ж час)? Няясна, чаму ў адзін з разьдзелаў трапілі рэцэнзіі на ўкраінскія гурты «Воплі Відаплясава», «Тартак», а шмат у чым паказальныя ўкраінцы «Плач Ераміі» ці «Акіян Эльзы» ня згадваюцца. Дый і наагул няясна, навошта ў кнігу, прысьвечаную беларускаму року, уключаць рэцэнзіі на тры ўкраінскія, тры нямецкія і адзін чэскі дыск. Становіцца зразумела зноў жа пры размове з аўтарам: гэта кніга рэфлексій на тыя дыскі/касэты/кружэлкі/бабіны, якія *праслухалі* аўтары. Добра, а чаму няма матэрыялаў пра «бітлоў» з «ролінгамі»?..

Аднак усе гэтыя заўвагі, па сутнасьці, нічога ня вартыя, бо выхад «222 альбомаў» — зьява выключная. Айчыннай культур-журналістыцы не ставала вось такога грунтоўнага тома, які ня згубіцца на палічцы побач зь іншымі таўшчэзнымі выданьнямі. Магчыма, што гэтае выданьне прастымулюе попыт на беларускія дыскі (хаця можа быць і наадварот), а кагосьці зарыентуе ў нашай музыцы. Зрэшты, лепшага за гэтую кнігу на акрэсьленую тэму нічога больш няма.

**Сяргей Будкін**

# Пчолы бароняць вульляў сваіх

**Наталка Бабіна** піша пра кнігу лідэра ўкраінскага руху Берасьцейшчыны.

Маральны закон закладзены ў чалавеку ад нараджэньня — і гэта (нароўні з зорным небам над галавой) больш за ўсё дзівіла Канта. Праўда, ёсьць людзі, пазбаўленыя памянутага маральнага закону, і мы ўсе іх ведаем — але цяпер размова не пра іх.

Мікола Казлоўскі — нязьменны галава Ўкраінскага грамадзка-культурнага аб'яднаньня Берасьцейшчыны — выдаў кніжку пра тое, як арганізоўвалася і працавала, пакуль улады яе не закрылі, гэтая арганізацыя.

І амаль адразу Інтэрнэт, які ведае ўсё, прынёс паведамленьне, што гэтыя самыя цудоўныя *ўлады* распарадзіліся вярнуць кнігу аўтару з усіх бібліятэк, куды ён яе разаслаў.

На форуме TUT.BY тэма «На якой мове гавораць мясцовыя на Берасьцейшчыне», запачаткаваная яшчэ ў 2003 годзе, была прагледжана больш за 6400 разоў, утрымлівае больш за 700 адказаў і пэрыядычна зноў і зноў выплывае ў першую дзясятку — прычым нават у самыя трывожныя тыдні. Думаю, гэта якраз і сьведчыць пра дзеяньне маральнага закону ўнутры нас. Бо голас крыві — гэта не пусты гук.

Кніга М.Казлоўскага, па сутнасьці, — аповед аб тым, як душылі ягоную арганізацыю ўлады, пачынаючы ад таго моманту, калі ў бурлівыя дні перабудовы яна ўзьнікла. Разганялі пікеты міліцыяй. Не перарэгістроўвалі. Не давалі друкаваць газэту. Затое аблівалі брудам у сваіх газэтах. І галава КДБ Шыркоўскі папярэджваў (што праўда, пацукоў не шукаў). А «ўкраінцы» рабілі, што маглі.

Але ўлады ўладамі, зь імі, зрэшты, усё зразумела. Горка тое, што і менскія дэмакраты ніколі ня тое што не падтрымалі берасьцейцаў-украінцаў, але заўсёды ставіліся да іх варожа. А каб менш выказваліся ў стылі: «У мяне цешча жыве ў Маларыце, там ніхто па-ўкраінску не гаворыць», не выступалі супраць украінскіх школ, украінскіх газэт, украінскіх аб'яднаньняў — то, можа, зараз ня мелі б мільёна зрусіфікаванага насельніцтва. Бо патэнцыял быў немалы.

Ня стаўлю на мэце ў чарговы раз даводзіць, што белае — гэта белае. Але калі ўжо беларускія дэмакраты будуць кіравацца цудоўным лёзунгам «Свабода. Праўда. Справядлівасьць», то хай бы гэта датычыла і праблемаў украінскасьці Берасьцейшчыны... Калі яшчэ не запозна гаварыць пра гэтыя праблемы. Але калі ўжо, ня дай Бог, запозна, то і пра беларускасьць гаворкі ня будзе. Тады сюды, на роўнае вытаптанае поле, можна будзе сьмела перасяліць зь Пецярбургу Скарыну. А памятаеце геніяльныя словы, якія ён напісаў яшчэ да пераезду ў Пецярбург? «Панежа ад прыражэньня зьверы хадзяшчыя ў пустыні знаюць ямы свая, пціцы ведаюць гнёзды свая, пчолы бароняць вульляў сваіх, тако ж і людзі, і гдзе зрадзіліся і ўскормлены суць, к таму месцу вялікую ласку імаюць».

Бы тая скарынаўская пчала, сп.Казлоўскі бароніць вульлі свае, і дай нам усім Бог — і маладым, і старым, і беларусам, і украінцам — ягонай вытрымкі і мужнасьці ў справе абароны месцаў, дзе мы нарадзіліся і ўскормленыя.

Дарэчы, вельмі раю сп.Міколу разьмясьціць свой твор у Інтэрнэце. Гэта дасьць магчымасьць пазнаёміцца зь ім шырокаму колу зацікаўленых і зьвядзе на нішто намаганьні ідыётаў, якія забараняюць бібліятэкам прымаць кнігу. Хай тады падпіраюць кіем гару.

**Микола Козловський. Українське відродження на Берестейщині у 80—90-х роках XX століття.** — Славянск, 2006. — 44 с. Наклад 500 ас.

# Краіна вынаходніцтваў

У гісторыі Польшчы шмат не вядомага для нас актуальнага. **Алег Дзярновіч** піша пра кнігу Мар'яна Семаковіча.

## Сапраўдныя славяне

Год таму, якраз на Купальле, мне давялося быць у Кракаве. Прэзыдэнт Кракава (мэр гораду), стоячы перад сваімі сугрмадзянамі на ярка асьветленым начным беразе Віслы, натхнёна заявіў: «Хто хоча адчуць сапраўднае славянства, няхай прыязджае да нас, на нашыя сьвяты!» Гэтая фраза сталася для мяне зусім нечаканай ды прымусіла задумацца. Столькі разоў з вуснаў штатных прапагандыстаў у Менску і Маскве прыходзілася чуць пра спрадвечную славянскасьць, менавіта тут агучвалася столькі прэтэнзіяў на гістарычную славянскую спадчыну, што іншыя гульцы на гэтым полі як бы не браліся да ўвагі. Між тым, калі прыгадаць звыклы ўнівэрсытэцкі курс, то сапраўды робіцца зразумелым, што калі хто і можа прэтэндаваць на ролю прадаўжальніка славянскай традыцыі, то гэта менавіта палякі. Беларусам зь іхнымі балцкімі карэньнямі лепей увогуле памаўчаць. Расейцы з гледзішча антрапалёгіі і гісторыі імпэрыі — вельмі стракаты народ. Бальшыня ж сучасных археолягаў і этнолягаў прарадзімай славянаў (г.зн. геаграфічным рэгіёнам, дзе тыя вылучыліся з агульнага індаэўрапейскага насельніцтва) называюць Паўднёвую Польшчу — менавіта на берагах Віслы сфармавалася гэтая своеасаблівая частка індаэўрапейцаў. І менавіта палякі ў сваёй мове захавалі тыя архаічныя праславянскія рысы, якія так дзівяць іхных усходнеэўрапейскіх суседзяў — усе гэтыя насавыя о$^{н}$ (ą), э$^{н}$ (ę). Старажытная кірылаўская азбука таксама мела для пазначэньня гэтых гукаў асобныя літары — так званыя «юс вялікі» і «юс малы». Але сучасныя кірылаўскія народы не захавалі такіх адметнасьцяў, таму і названыя літары мёртвыя. Канфэсійны падзел у гэтай дыскусіі ня можа быць аргумэнтам, бо гаворка вядзецца яшчэ пра тыя рысы і адметнасьці, якія сфармаваліся ў дахрысьціянскі пэрыяд.

## Як выжываць пад акупацыяй

Гісторыі эўрапейскага сла

**Працяг на старонцы 40.**

**Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народу. X—XXI стст.** / Рэд. і ўкл. тэксту Мар'ян Семаковіч; Пер. з польск. Ганна Цішук. МЗС Рэспублікі Польшча; Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь; Польскі інстытут у Менску. — Варшава: Demart Sp. z o. °o., 2005. — 312 с., карты.

АЛЕНА АНЦІПЕНКА

# Музычныя загадкі



Вось кроцік крочыць цераз поле.
Нясе ён скрыпачку паболей.
Зусім ня так яе трымае —
Чамусьці седзячы іграе.
І ўсе зьдзіўляюцца пад ліпкай:
«Нібыта скрыпка, ды ня
скрыпка».
На чым, дазнацца б мы хацелі,
Ён грае? На...

*(віяланчэлі)*



Прыйшоў пад ліпку сьлімачок
І з торбы выцягнуў смычок.
А потым інструмэнт узяў
І на плячо яго паклаў.
Зайграў. І цэлы дзень пад ліпкай
Пяшчотна ўсім сьпявала...

*(скрыпка)*



А сьледам цягнецца індык.
Ўжо не смычок нясе, а смык.
Сяброў склікае на падмогу —
Паставіць скрыпку на падлогу:
І зноўку дзівяцца пад ліпкай:
«Нібыта скрыпка, ды ня скрыпка!»
А справа ў тым, што ў гэты раз
Гучаў пад ліпкай...

(кантрабас)



Тут кузурка прыбягала
І па клявішах скакала —
І па белых, і па чорных
Разам з чапляй і варонай.

Па чарзе сыгралі гаму,
Вальс і полечку таксама.
Здагадацца не складана.
Гралі ўсе на....

(фартэпіяна)

МАЛЮНКІ СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

# Краіна вынаходніцтваў

Працяг са старонкі 25.

вянскага народу якраз прысьвечана аглядная кніга «Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народу». Менавіта таго народу, які сваю індэнтычнасьць адстойваў у супрацьстаяньні зь нямецкім сьветам. І гэта ня толькі падзеі XIV—XV ці XX ст., але таксама эпізод з прымусовай германізацыяй і палітыкай «Культуркампфу» ў XIX ст. на тэрыторыях, якія па падзелах Рэчы Паспалітай адышлі да Прусіі.

Таксама да недастаткова вядомага на ўсходзе Эўропы належыць сюжэт з мангольскім нападам XIII ст. — пасьля спусташэньня Русі нападнікі зьнішчылі таксама Кракаў і Ўроцлаў. Але менавіта ў Польшчы, а зусім не на Русі, мангольскія войскі завязьлі і ўрэшце вымушаны былі спыніць свой пераможны эўрапейскі паход.

Польская гісторыя мае ў здабытках некалькі вынаходніцтваў, якія вылучаюць іх сярод суседзяў ды ахопліваюць розныя стагодзьдзі. Вялікую дзяржаву польская эліта стварала ў меншай ступені шляхам ваенных заваёваў, але праз унійныя працэсы, уключаючы ў сваю палітычную і культурную арбіту разнастайныя балцкія, славянскія і нямецкамоўныя народы.

Вельмі пазытыўны для нас досьвед жыцця палякаў пад акупацыяй у другой палове XIX — пачатку XX ст. Пасьля паразаў усіх паўстаньняў у асяродзьдзі лібэральнага мяшчанства, буржуазіі і землеўладальнікаў, зацікаўленых у пабудове сучаснага грамадзтва, была сфармулявана праграма «*арганічнае працы*» ва ўсіх галінах жыцьця. Паводле гэтай канцэпцыі, у эканоміцы стаўка была зробленая на ўласныя матэрыяльныя і фінансавыя рэсурсы. І той пэрыяд стаў часам інтэнсіўнага разьвіцьця польскай індустрыі і буржуазіі. У сфэры навукі ідэі «арганічнай працы» паспрыялі стварэньню культурна-адукацыйных установаў, якія фінансаваліся заможнымі палякамі. У галіне культуры «арганічная праца» сутыкнулася зь перашкодамі з боку цэнзуры і паліцыі. У школьнай справе стаўка была зроблена на падпольнае навучаньне і хатнюю адукацыю. Можна сьцьвярджаць, што, калі ў 1914—1918 гадах у Эўропе поруч зь вялікімі катастрофамі надышлі і грандыёзныя перамены, польскае грамадзтва было да іх падрыхтаванае — палякам засталося толькі пачапіць кукарды, а ўсе іншыя грамадзкія і палітычныя інстытуты ў іх ужо ў той ці іншай форме функцыянавалі. Безумоўная адметнасьць польскай гісторыі найноўшага часу — заключэньне кампрамісу падчас *круглага стала* 1989 г. і мірны пераход ад таталітарнага сацыялізму да дэмакратыі.

## Як у вас, так і ў нас

У польскай гісторыі мы можам знайсьці і падказкі да некаторых балесных беларускіх пытаньняў. Беларускія гісторыкі, прычым адрознай палітычнай скіраванасьці, ужо сфармавалі нашыя ўяўленьні пра адарванасьць шляхецкіх рэвалюцыянэраў XIX ст. ад народу, чым, маўляў, была прадвызначана слабасьць далейшага нацыянальнага руху. Але тут я проста працытую з анатаванай кніжкі эпізод пра паўстаньне 1846 г. у Заходняй (польскай частцы) Галіцыі і вакол Кракава: «Падпольшчыкі не інфармавалі сялянаў аб мэтах паўстаньня, а абвешчаны 21 лютага 1846 г. Нацыянальным урадам Польскай Рэчы Паспалітай «Маніфэст да польскага народу», які заклікаў да барацьбы за нацыянальнае вызваленьне, сяляне сустрэлі абыякава. Аўстрыйскія ўлады выкарысталі гэтую сытуацыю пасьля няўдалага наступленьня паўстанцаў на Тарнаў, арганізаваўшы ўзброенае выступленьне сялянаў супраць галіцыйскай шляхты — так званы бунт Якуба Шэлі. Пачаліся масавыя забойствы землеўладальнікаў, зьнішчалася іх маёмасьць, асабліва ў Тарноўскім ваяводзтве. Загінула каля 1000 чалавек, было спалена каля 450 маёнткаў». Мне здаецца, што ў свой час мы захапіліся нацыянальным прачытаньнем гісторыі ды забыліся на сацыяльныя фактары і супярэчнасьці. Гэтым самым мы адчынілі шлюзы для новых нацыянальных комплексаў.

## Далікатная тэма Рэчы Паспалітай

Вось яшчэ адна тэма, якой нам ня ўнікнуць — статус ВКЛ у польскай гістарычнай сьвядомасьці. Як бы мы да гэтага ня ставіліся, але Вялікае Княства ўспрымаецца палякамі як частка польскай гісторыі. З гэтых пазыцыяў і напісана кніжка. Падставы для такіх высноваў сапраўды ёсьць — стагодзьдзі суіснаваньня ў фэдэрацыі, пашырэньне ў Вялікім Княстве польскай культуры і мовы, наяўнасьць вытокаў многіх польскіх шляхецкіх родаў менавіта з ВКЛ. Але ня будзем забывацца, што ў гэткай «польскасьці» была таксама закладзена пастка для Рэчы Паспалітай. Сапраўды, у канцы XVI—XVII ст. слова «польскі» стала выконваць функцыю прыметніка да назвы фэдэрацыйнай дзяржавы — Рэчы Паспалітай, і ў гэтым хаваліся нутраныя супярэчнасьці з прычыны супадзеньня агульнадзяржаўнага акрэсьленьня з канкрэтным этнічным, што не магло быць фактарам кансалідацыі фэдэрацыйнай дзяржавы. Як аналяг можна прыгадаць прыметнік «брытанскі», які з пачатку XVIII ст. ахопліваў ня толькі Ангельшчыну і Валію, але таксама Шатляндыю. Брытанскі варыянт апынуўся больш жыцьцёвым. Зрэшты, сёньня і шатляндцы не называюць сябе брытанцамі. Заканчваючы гэтую дыскусійную тэму, я прапаную больш мяккую фармулёўку — гісторыя ВКЛ мае дачыненьне *таксама* і да польскай гісторыі.

## Менск без барока

Але беларуская праблематыка зусім не галоўная ў кніжцы з польскай гісторыі, што адлюстравалася і ў мапах, якімі так багатае гэтае выданьне. Вядома, перад складальнікамі мапаў стаяла задача адлюстраваць рэаліі найперш польскіх тэрыторыяў. І, напрыклад, на тэматычнай мапе Рэчы Паспалітай «Помнікі культавага дойлідзтва эпохі барока» Менск рэпрэзэнтаваны зусім сьціпла — безь ніякага пазначэньня бэрнардынскіх, езуіцкага, дамініканскага... баракальных ансамбляў. Добра, што гэтую мапу ня бачаць фундатары гэтых помнікаў Аляксандар Слушка ды менскі ваявода Крыштап Завіша. Яны палічылі б несправядлівым маўчаньне пра іхную дзейнасьць.

Кніга «Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народу» выйшла пад эгідай Міністэрства замежных справаў Польшчы і гэтым самым як бы рэпрэзэнтуе найбольш стрыманы, «афіцыйны» погляд. Але ж і ў такім варыянце яна стварае поле для дыскусіяў і правакуе на пошук аналёгіяў. Жывая энэргетыка польскай гісторыі часам стварала праблемы самім палякам. Мы можам зайздросьціць ці крытыкаваць, але мой прагноз наступны: цікавасьць беларускага грамадзтва да польскай гісторыі будзе паглыбляцца.

## ІМПРЭЗА

**Разанаў прэзэнтуе новую кнігу**

**У чацьвер, 3 жніўня,** павінны выйсьці сыгнальныя асобнікі новай кнігі Алеся Разанава. Гэта трэці том збору твораў, што выдае «Логвінаў», там сабраныя паэмы. На гэтым тыдні ў Разанава мае зьявіцца і свой сайт. У пятніцу, 4 жніўня, Разанаў ладзіць прэс-канфэрэнцыю пра «яйкаквадраты» і новую кнігу – у фальварку «Добрыя мысьлі», аб 11-й.

**Werk, Litara.net**

## ВЫСТАВА

**Перад вобразам тваім**

**Да 10 жніўня** ў менскім Палацы мастацтва (вул. Казлова, 3) працуе пэрсанальная выстава мастацкай вышыўкі Алы Гопшы. Творы выкананы ў розных тэхніках ніткамі мулінэ, воўнай, шоўкам, штучнымі ніцямі. Партрэты, абрусы і сурвэткі, вопратка і абутак...

## СПОРТ

**Чэмпіянат Беларусі па футболе. 16 тур**

**5 жніўня, субота**

«Шахцёр» (Салігорск) — «Белшына» (Бабруйск).
«Нафтан» (Наваполацак) — «Гомель».
«Дняпро» (Магілёў) — «Лякаматыў» (Менск).
«Тарпэда» (Жодзіна) — «Лякаматыў» (Віцебск).
МТЗ-РІПА — «Дынама» (Берасьце).
«Нёман» (Горадня) — БАТЭ (Барысаў).
«Дарыда» (Ждановічы) — «Дынама» (Менск). Стадыён у Кунцаўшчыне.

**АГ**



# 500 гадоў Клецкай бітвы

5 жніўня 1506 г. на рацэ Лань войскі ВКЛ пад кіраўніцтвам Міхала Глінскага разграмілі 20-тысячнае войска крымска-татарскіх захопнікаў. Было вызвалена 40 тысяч нявольнікаў, Клецкая бітва стала ў адзін шэраг з Грунвальдам і Воршай у беларускай вайсковай гісторыі. Пасьля яе татары не дазвалялі сабе такіх буйных набегаў на беларускія землі.

**Праграма ўрачыстасьцяў**

**4 жніўня**

12.00. Адкрыцьцё выставы Беларускага саюзу мастакоў «Адплата» (Клецак, Музэй гісторыі Клеччыны).

13.00. Сустрэча ля помніка памяці Клецкай бітвы і ўскладаньне кветак (Клецак).

**5 жніўня**

11.00. Навукова-практычная канфэрэнцыя Інстытуту гісторыі НАН, Беларускага дзяржаўнага пэдунівэрсытэту імя Максіма Танка (Клецкі райвыканкам).

17.00. Адкрыцьцё дзіцячай і моладзевай выстаўкі «Клецак — наш гонар і слава».
Навуковая канфэрэнцыя.
Сьвяточны канцэрт з удзелам беларускіх паэтаў, музыкаў, песьняроў (Менск, сядзіба ТБМ, вул.Румянцава, 13).

**6 жніўня.**

12.00 Сьвяточны канцэрт (Клецкі гарадзкі парк).

**24 жніўня**

18.00. Менская прэзэнтацыя выставы «Адплата» (Касьцёл Сьв.Сымона і Алены).

**МГ**

## НАШЫ ШАШКІ

# Камэнтуе чэмпіён

Мы паведамлялі пра перамогу гомельскага нафтаздабытчыка Яўгена Кандрачэнкі ў першынстве краіны па расейскіх шашках. Майстар спорту Кандрачэнка другі раз запар апярэдзіў двух гросмайстраў, экс-чэмпіёна сьвету Аркадзя Плакхіна і дзейнага чэмпіёна зямной кулі Андрэя Валюка. Выпускнік Гомельскага тэхнічнага ўнівэрсытэту імя Сухога, 27-гадовы машыніст каратажнай станцыі ласкава падзяліўся з «НН» узорамі сваёй творчасьці, адкамэнтаваўшы іх на добрай беларускай мове.

**Я.Кандрачэнка — Я. Бельскі, 2005. Бліц.**

1…ef4? (заставалася 1…bc7! 2. fg3 gf4 3. eg5 hh2 4. hg5 fh4 5. dd8 bb2 6. ca3=) 2. de5!! – калясальна! Чатыры магчымыя бai не выратоўваюць. Асабліва прыгожа 2…fd2 3. ce1! — тут яшчэ тры магчымыя бai не выратоўваюць.



* * *

Зямляк Кандрачэнкі Андрэй Толчыкаў выйграў чэмпіянат сьвету па шашках-100 сярод юнакоў (U-16), які ладзіўся ў Манголіі на пачатку ліпеня. Далучаемся да віншаваньняў!

**Вольф Рубінчык**

ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

# Д'ябал з нафталіну

У кінапракаце — працяг і паўтор клясычных стужак Рычарда Донэра. «Вяртаньне Супэрмэна» ды «Омэн 666».

**«Вяртаньне Супэрмэна»**
(«Superman Returns»)

ЗША—Аўстралія, 2006, каляровы, 154 хв.

**Жанр:** кінакомікс

**Адзнака:** 4 (з 10)

Пасьля шасьцігадовых вандровак па космасе Супэрмэн вяртаецца на Зямлю. Кінутая каханка Лоіс Лэйн адпомсьціла артыкулам «Чаму Супэрмэн непатрэбны?» дый наладзіла асабістае жыцьцё, бартануўшы мужчыну сваёй мары. І толькі нягоднік Лекс Лютэр памятае пра былога ворага. Лысы інтрыган крадзе крышталі плянэты Крыптон і пагражае цэламу сьвету...

Стваральнікі «Вяртаньня» яўна ня ведаюць, што рабіць з адроджаным Супэрмэнам. Вялыя сямейныя праблемы з таемным каханьнем і дзіцём-астматыкам, ураздроб — прыгоды й выратаваньні і непрыхавана халтурны Кевін Спэйсі ў ролі кінанягодніка. Глямурны Брэндан Рут у блакітным касьцюмчыку ня мае харызмы колішняга Супэрмэна — Крыстафэра Рыва. А калі супэргерой паўтарае подзьвіг Заснулае прыгажуні — гэта выглядае на зьдзек.

Рэжысура Браяна Сынгера («Людзі-Х») — апатычна-камэрцыйная: катастрофы самалёта, жаночы віск і Марлон Брандо вылучаюцца. Сярод рэанімаваных масак Марлон Брандо — самы жывы. Супэрмэнаў тата сьцягнуты з выкінутых нарэзак папярэдніх фільмаў. Памерлы Брандо пратэставаць ня мог.

Усё ж сцэнарныя прыдумкі карціны саступаюць трэшавым ляпам «Беларусьфільму»: вялікія грошы дазваляюць зрабіць цукерку зь любой сыравіны.

**«Омэн 666»** («Omen»)

ЗША, 2006, каляровы, 110 хв.

**Жанр:** містыка

**Адзнака:** 3,5 (з 10)

Жонка амэрыканскага дыплямата перанесла цяжкія роды. Дзіця сканала, і муж употайкі ўзяў на выхаваньне хлопчыка, якога выдаў за свайго сына. Празь пяць гадоў дыплямат пачынае падазраваць, што яго сын — антыхрыст.

Карціна Джона Мура амаль не адступае ад арыгіналу Рычарда Донэра. Чорны сабака-ахоўнік, нянька-сатаністка (Мія Фэроў са звычкамі Шапакляк), зьляканыя малпы, адсечаная галава. Як і ў карціне 30-гадовай даўніны, сын д'ябла зьнішчае людзей на сваім шляху — і мае анёльскі выгляд дзіцяці.

Але зусім ня страшна. Джон Мур пужае рэзкімі гукамі й зьменаю плянаў, што добра вядома зь японскіх жахавак. Найбольшы кашмар фільму — ігра Ліва Шрайбэра (дыплямата Торна). Адсутнасьць акторства нязграбна кампэнсуюць закадравымі грымотамі. Дарэмна.

Справа ня толькі ў талентах, сам час зьмяніўся.

**Андрэй Расінскі**

КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

## Субота, 5 жніўня

**«Лад», 12.40.**
«Прыгоды Бураціна»
Беларусь, 1975, рэж. Леанід Нячаеў.

Дыямэнт «Беларусьфільму». Прыгодніцкая казка на ўсе часы — і для ўсіх узростаў. Карціна, купленая ў 91 краіну. Японцы пераклалі ўсе песьні зь фільму — і выдалі асобнай кружэлкай.

**БТ, 23.10**

«Ціхі амэрыканец»

ЗША—Нямеччына—Аўстралія, 2002, рэж.Філіп Нойс.

Палітычная драма паводле раману Грэма Грына.

Сайгон, 1952 год. У Віетнаме ідзе вайна за незалежнасьць. І толькі ангельскі журналіст Томас Фаўлер вядзе спакойны лад жыцьця, не зьвяртаючы ўвагу на закалоты. Але аднойчы да яго прыходзіць нечаканы госьць…

Прыз Амэрыканскай асацыяцыі палітычнага кіно, намінацыі на «Оскара», «Залаты глёбус», прэмію Брытанскай кінаакадэміі.

## Нядзеля, 6 жніўня

**«Лад», 16.10**

«Сьвятло далёкай зоркі. Ян Скрыган»

Беларусь, 2006.

Перадача, прысьвечаная слыннаму беларускаму пісьменьніку.

**БТ, 22.20**

«Лялькі»

Японія, 2002, рэж. Такешы Кітана

Фільм—прыпавесьць

Тры сучасныя гісторыі, натхнёныя эстэтыкай тэатру Бунраку. Прыпавесьці суму, каханьня й прыгажосьці. Закаханыя, бос якудзы, дзяўчына ля мора — у неверагодна пекным паэтычным відовішчы. Зьвярніце асаблівую ўвагу на культуру кадра й настрой карціны.

Галоўны прыз МКФ у Дамаску, прыз «Адмысловая падзея» на фэсьце «Аблічча каханьня» ў Маскве.

**«Лад», 22.30**

«Сомэрсьбі»

ЗША—Францыя, 1993, рэж. Джон Эміэл.

Драма.

Пасьля Грамадзянскай вайны ў ЗША Джэк Сомэрсьбі, якога ўсе лічылі загіблым, вяртаецца да жонкі й дзяцей. Жыцьцё працягваецца — толькі сабака не прызнае гаспадара, дый памер ботаў Джэка зьмяніўся…

Ролі выконваюць: Рычард Гір, Джодзі Фостэр.

**AP**

КІНО НА DVD

**MASTER RECORDS**

**«Сьвятло навокал»**

Камэдыйная драма, ЗША, 2005, рэж. **Ліў Шрайбэр**.
У ролях: **Элайджа Вуд, Яўген Хац.**

Джонатан зьбірае сямейныя ўспаміны: фатаграфіі, карткі, аповеды. Аднойчы герой едзе на Украіну, каб знайсьці жанчыну, якая выратавала ягонага дзядулю ад нацыстаў у 1942 г.

**Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08**

**...аварыю БелКА выкарыстоўвалі для барацьбы зь бяссоньніцай.**



**Адзін разьбіты спадарожнік, два разьбітыя спадарожнікі, тры разьбітыя спадарожнікі... праклятая бяссоньніца... чатыры разьбітыя спадарожнікі...**

**...супрацоўнікі заходніх амбасадаў у Беларусі зрабілі высновы з гісторыі латвійскага дыплямата.**

**— Нашто столькі пражэктараў, каханы?**
**— Паколькі нас будзе здымаць КДБ, я хачу паставіць сьвятло такім чынам, каб потым гледачы БТ не заўважылі мой тоўсты жывот.**






**...беларускія дыпляматы хацелі сапраўды давесьці эўрапейцам, што забарона на ўезд кіраўніцтва Беларусі ў ЭЗ — неэфэктыўная мера.**

**— Шухер, таварыш пасол! Жандары!**

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

## У НУМАРЫ

### Жалезная заслона



Рэпартаж з суду над «Партнэрствам». **Старонка 3.**

### На вяроўцы з шостага паверху



спусьцілася актывістка «Бунту», ратуючыся ад арышту.

**Старонка 5.**

### Трашчанок зарэзаў атляс



«Гэтая камісія за апошнія тры гады ніводнага дапаможніка не зацьвердзіла, апроч курсу па Вялікай Айчыннай вайне. **Старонка 6.**

### Аўтастопам да Швайцарыі



Рэпартаж Ціны Клыкоўскай і Юльяна Гайдука з падарожжа ў Францыю ды Швайцарыю. **Старонка 18.**

### Вітаўт Мартыненка



выдаў энцыкляпэдыю беларускага року. **Старонка 26.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Г.Дзісна, Віленск. Губ.** Сьмешна сказаць, як людзі ацэніваюць адзін другога. Як запытаешся: хто ў нас важнейшы? — дык і пачынаюць вылічаць тых, хто багацейшы, у каго больш бліскучых гузікоў, а ня тых, хто разумнейшы, хто больш працуе дзеля грамадзкай карысьці і дзеля лепшай долі другіх. Важны чалавек — гэта, па-моему, чалавек разумны, які стараецца, каб якую-небудзь зрабіць карысьць людзям. Але, на няшчасьце, людзей разумных мала ў нас, найбольш такіх, што глядзяць толькі, каб сябе ўспамагчы, хоць бы нават і крыўдай бліжняга. Шмат у нас ёсьць людзей «шляхтуючых», каторыя, навучыўшыся колькі слоў папольску і крыўляючы іх, як крывое люстэрка крывіць людзкі твар, стараюцца паказаць, што яны быццам нешта лепшае, разумнейшае, а таго ня ведаюць, што разумны чалавек будзе толькі сьмяяцца зь іх, бо зразумее, што гэта толькі маска, каб паказацца ня тым, чым яны ёсьць запраўды.

**В.С.**

**«Наша Ніва», №28—29, 1911**

**«Наша Ніва» шукае на працу вярстальніка на поўную стаўку**

Ахвотныя хай дасылаюць зьвесткі пра сябе на электронную пошту nn@promedia.by.

# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 2.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ВІТАНЬНІ**

**Антось**! Віншуем цябе з днём народзінаў. Любім, верым, чакаем. Твае бацькі

**КАНТАКТЫ**

**Міхась Грыгор'еў**! Даўно цябе ня бачыў. Прыяжджай на фэстываль «Аршанская бітва» 9 верасьня, хоць пагаворым. Віктар Сьцяпанаў

**КВАТЭРА**

**Шукаем** аднапакаёвую кватэру. Своечасовую аплату і парадак гарантуем. Т.: 567-74-45 (Сямён), 017-269-45-87 (Тацяна)

**КНІГІ**

**Кнігаабмен**. Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Т.: 753-91-97

**ТВОРЧАСЬЦЬ**

**Стварaецца** вольнае беларускае моладзевае выдавецтва «Вольнае слова». Шукаем людзей. Заклікаем моладзь, што стварае на беларускай мове, дасылаць свае творы з пазначэньнем імя, прозьвішча/псэўданіму, даты нараджэньня, месца жыхарства й кароткіх зьвестак аб сабе на e-mail drukarna@gmail.com далучанымі файламі. Т.: 566-08-29 (Алег)

**ТРАКТАР**

**Куплю** трактар МТЗ. Т.: 164-93-85

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам.галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2371. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 02.08.2006.
Замова № 4257.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.